WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ЛЮТАГА 2012 г. АЎТОРАК

№ 34 (27149)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «БЕЛАРУСЬ ЦЭНІЦЬ ПАРТНЁРСТВА І НЕ ПРЫМАЕ ДЫКТАТУ»

**БЕЛАРУСЬ высока цэніць партнёрства і дружалюбнасць ва ўзаемаадносінах з усімі дзяржавамі і не прымае дыктату. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даверчыя граматы паслоў дзевяці дзяржаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«На нашу думку, кожная краіна незалежна ад займаемай тэрыторыі або эканамічнага патэнцыялу мае права самастойна вызначаць шлях развіцця і выбудоўваць адносіны са знешнім светам на роўнай і справядлівай аснове», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што на міжнароднай арэне Беларусь нязменна рэалізуе прынцыпы шматвектарнасці і збалансаванасці. «Мы высока цэнім партнёрства і дружалюбнасць ва ўзаемаадносінах з усімі дзяржавамі і не прымаем дыктату», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, сучасная Беларусь з'яўляецца маладой, адкрытай свету дзяржавай, якая дынамічна развіваецца. «Мы планамерна і паслядоўна развіваем і ўмацоўваем дзяржаву і яе суверэнітэт, паляпшаем умовы жыцця людзей, забяспечваем сацыяльную стабільнасць і згоду», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка прапануе Японіі пабудаваць атамную станцыю ў Беларусі.

«Калі вы вырашыце дзе-небудзь пабудаваць атамную станцыю, Беларусь павінна быць у спісе першых. Вы павінны ў нас пабудаваць прыгожую, добрую атамную станцыю, а японцы ўмеюць гэта рабіць...» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Так, здарылася бяда (аварыя на японскай АЭС «Фукусіма». — **Заўвага БЕЛТА**), але гэта не значыць, што мірны атам нікому не патрэбны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь гатова і ў далейшым дзяліцца вопытам у пераадоленні чарнобыльскай катастрофы, прымаць на аздараўленне японскіх дзяцей з рэгіёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на АЭС «Фукусіма». «Вы практычна першыя прыйшлі да нас на дапамогу пасля чарнобыльскай катастрофы. Цяпер бяда прыйшла на вашу зямлю, і мы гатовы гэты агульны вопыт выкарыстоўваць на карысць нашых народаў і дзяржаў», — сказаў Прэзідэнт.

У якасці аднаго з цікавых праектаў, які можна было б рэалізаваць, Аляксандр Лукашэнка назваў будаўніцтва ў Беларусі завода па вытворчасці японскіх легкавых аўтамабіляў. «Мы самыя льготныя ўмовы прадаставім. Рабіце ў Беларусі машыны і прадавайце на агульнай мытнай прасторы, гандлюйце з Еўропай. Мы дастойна будзем з вамі працаваць, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта так на першы погляд. А праектаў вельмі шмат. Таму калі ласка. Мы вам створым умовы лепшыя, чым яны існуюць у Японіі для сваіх вытворцаў».

«Мы гатовы да больш сур'ёзнага супрацоўніцтва з Японіяй. Тут вас чакаюць, і вы чамусьці не бачыце і не чуеце, што вас чакаюць з вашымі тэхналогіямі, арганізацыяй вытворчасці, вашым вопытам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, прыйшоў час рэалізаваць патэнцыял узаемадзеяння паміж Беларуссю і Японіяй у эканамічнай і навукова-тэхнічнай галінах.

Беларусь у выпадку неабходнасці можа вельмі жорстка адказаць на санкцыі Еўрасаюза, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Гэтыя санкцыі, якімі вы, еўрапейцы, размахваеце перад нашым носам, вы зразумейце — мы пакуль церпім. Але калі толькі вы пераступіце чырвоную лінію, мы адкажам вельмі жорстка», — сказаў Прэзідэнт.

«Мы ў цэнтры Еўропы. 100 млн тон грузаў перамяшчаецца з Усходу на Захад праз нас, прытым у поўнай бяспецы. Мы будуем тэрміналы на граніцы, прапускаем вашы грузы туды-назад, забяспечваем іх бяспеку. Ніводнай скаргі не было за гэтыя гады, пакуль я Прэзідэнт, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Што яшчэ трэба еўрапейцам, я не разумею? Патрэбна нестабільная Беларусь? Не патрэбна. Вам не падабаецца Лукашэнка і той курс, які ён праводзіць? Але ад гэтага мы не адступім, пакуль мяне выбіраюць Прэзідэнтам. Калі народ галасуе за гэтага Прэзідэнта, значыць ён падтрымлівае яго курс. Мой курс адзін — я адданы свайму народу».

«Калі ў Еўропе хтосьці думае аб тым, што нас па-ранейшаму яшчэ можна нахіліць нейкімі санкцыямі, папрокамі, патрабаваннямі — гэта дарога нікуды. Нават, калі мы застанемся адны без Расіі, Кітая, без іншых нашых сяброў, паверце, мы будзем на смерць стаяць тут, як калісьці ў 1941-1945-м, абараняючы сваю незалежнасць і суверэнітэт, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі, звяртаючыся да прадстаўнікоў еўрапейскіх дзяржаў. — Гэта не нейкая бравурная пазіцыя. Мы проста хочам быць такімі, як вы — свабодалюбівымі, незалежнымі і адказнымі перад сваім народам. Мы зыходзім з пажаданняў нашага народа».

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, Беларусь не стварае праблем ні суседзям, ні краінам далёкага замежжа. «Я не разумею, якія могуць быць да нас прэтэнзіі. Мы разумеем, што сяму-таму не падабаецца тое, што мы тут робім, але нам таксама дзесьці, можа, штосьці не падабаецца. Але мы вельмі спакойна вытрымліваем пазіцыю, мы ніколі ні на кога не наступаем, не спрабуем кагосьці павучаць. Кожная дзяржава мае права развівацца так, як яна лічыць патрэбным, ні ў якім выпадку не ствараючы праблем суседзям і іншым дзяржавам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Беларусь не менш дэмакратычная, чым еўрапейскія дзяржавы. «Толькі вы паглядзіце больш уважліва на тое, што адбываецца ў Беларусі. Мы хочам спакою і стабільнасці», — заўважыў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым ён звярнуўся да пасла Нарвегіі Ёна Елведала Фрэдрыксена, нагадаўшы, што ў мінулым годзе як Беларусь, так і Нарвегія перажылі страшныя трагедыі. «І мы ведаем цану гэтай стабільнасці. Мы хочам чаго б гэта ні каштавала яе захаваць. Таму што спакой — гэта галоўнае ў жыцці чалавека», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

«Я проста патрабую ад еўрапейцаў: паглядзіце ўважліва на нашу краіну, і не рабіце гадасцей адносна Беларусі. Мы ж гэтага не заслужылі. Мы яшчэ даваенны ўзровень насельніцтва не аднавілі. Мы ж паклалі 3 млн чалавек на алтар нашай агульнай Перамогі. І што было б, калі б мы ў свой час не перамаглі? — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. — Таму трэба паважаць людзей. Таму што ў нас яшчэ жывыя тыя, хто бачыў гэту страшную вайну».

«Наша пазіцыя заснавана не на нейкіх там асабістых амбіцыях. Нам гэта не трэба. Яна заснавана на тых глыбінных прычынах, якія зыходзяць з нашага грамадства, нашага беларускага народа», — падкрэсліў беларускі лідар.

«А сяброў у нас шмат. І сёння тарпедаваць нашы адносіны з Еўропай і спрабаваць нас дзесьці прыструніць, пакрыўдзіць, пакараць — бесперспектыўна. Для нашай краіны, калі шчыра гаварыць, супрацоўніцтва з Расіяй, Кітаем, Індыяй, Цэнтральнай Азіяй — больш чым дастаткова. Мы забяспечым нармальнае жыццё нашых людзей. Але мы не хочам быць стрэмкай у еўрапейцаў, таму што тут цэнтр Еўропы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка пацвярджае нацэленасць Беларусі на далейшае ўмацаванне стратэгічнага партнёрства з Кітаем.

Прэзідэнт адзначыў, што беларуска-кітайскія адносіны характарызуюцца даверным палітычным дыялогам на вышэйшым узроўні, гандлёвымі і інвестыцыйнымі сувязямі, якія дынамічна развіваюцца.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што такія знакавыя і пілотныя праекты, як запуск спадарожніка сувязі і стварэнне Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку, — толькі пачатак поўнамаштабнага выкарыстання патэнцыялу міждзяржаўнага супрацоўніцтва.

«З Кітаем у нас няма абсалютна ніякіх напружанасцяў. Ну, нехта напружваецца наконт нашых адносін з кітайскай дзяржавай, але гэта іх праблемы. Мы дружым з вамі не супраць кагосьці, мы выбудоўваем супрацоўніцтва ў інтарэсах нашых дзяржаў», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь заўсёды будзе добрай апорай для кітайскага народа і дзяржавы. Прэзідэнт падзякаваў кітайскаму боку за ўсё тое, што ён робіць і зрабіў для Беларусі. «Мы ў вас шмат чаму навучыліся», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі заклікаў паслоў замежных дзяржаў непрадузята і аб'ектыўна ацэньваць Беларусь.

«Не сумняваюся, што вы зможаце непрадузята і аб'ектыўна ацаніць нашы рэаліі, пераканацца, што Беларусь не толькі надзейны і прадказальны партнёр, але і верны сябар, гатовы ў цяжкую хвіліну падставіць сваё плячо», — сказаў Прэзідэнт.

«Заклікаю вас выбудоўваць не проста ўзаемавыгадныя, а па-сапраўднаму шчырыя, даверныя адносіны паміж нашымі краінамі. І тады ваша дзейнасць тут будзе сапраўды паспяховай», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Прэзідэнт паабяцаў, што як кіраўнік дзяржавы будзе максімальна садзейнічаць эфектыўнай рабоце дыпламатаў на беларускай зямлі.

«Упэўнены, пасля больш блізкага знаёмства з нашай краінай, яе багатай гісторыяй, культурай, традыцыямі, вы станеце шчырымі сябрамі беларускага народа, прыхільнікамі ідэй узаемавыгаднага супрацоўніцтва, раўнапраўнага і паважлівага дыялога», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што дзейнасць кожнага з дыпламатаў стане важкім укладам ва ўмацаванне менавіта такіх адносін і будзе садзейнічаць збліжэнню дзяржаў, нарошчванню практычнага ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах.

ISSN 1990 - 763X

## У НАС НЕ ХВАРЭЮЦЬ!

**НА працягу дзесяці гадоў дзякуючы ініцыятыве настаўніка матэматыкі Алега Бычкоўскага, вучні мінскага ліцэя № 2 «маржуюць». У праграму ўрокаў фізічнай культуры загартоўванне не ўваходзіць, тым не менш ліцэісты з задавальненнем абціраюцца снегам, гуляюць у снежкі — так па тры хвіліны кожны дзень! І дарэчы, статыстыка ліцэйскага «маржавання» паказала: сезонныя хваробы не чапляюцца да тых, хто падтрымлівае зімовыя прабежкі.**

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**





Надвор'е

## ПАЦЯПЛЕЕ, СУР'ЁЗНЫЯ АПАДКІ І ВЕЦЕР ДА 22 М/С

**ВОСЬ сібірскія маразы канчаткова і сыходзяць ад нас, бо на гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі завітаюць паветраныя масы з Атлантыкі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Сёння ўдзень атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе чарговую порцыю снегу ў паўночна-заходнія рэгіёны краіны, дзе месцамі чакаецца і слабая мяцеліца. Усталюецца парывісты паўднёва-заходні вецер. Тэмпература ўдзень ад мінус 5 па ўсходзе, да плюс 1 градуса на захадзе краіны. У сераду снег чакаецца ўжо паўсюдна па краіне, уначы месцамі мяцеліца. Удзень у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях мокры снег будзе чаргавацца з дажджом, там жа магчымы туман і галалёд. Тэмпература ўначы на сераду яшчэ 2-9 марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 4 градусаў.

**Увага! Найбольш складаныя ўмовы надвор'я чакаюцца 23 лютага,** у чацвер, калі цыклон з Атлантыкі прынясе інтэнсіўныя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах прагназуюцца вельмі моцныя ападкі. Месцамі туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Усталюецца моцны заходні вецер парывамі да 15—22 м/с. Тэмпература ўначы на чацвер ад мінус 4 да плюс 2, удзень — ад 2 марозу па паўночным захадзе да плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе Беларусі.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, напрыканцы тыдня актыўны цыклон будзе адыходзіць убок, а на тэрыторыю Беларусі завітаюць паветраныя масы з паўночнай Атлантыкі. Усталюецца няўстойлівае надвор'е, часам чакаецца мокры снег. У пятніцу ў асобных раёнах захаваецца моцны парывісты вецер да 15—20 м/с. Тэмпература ўначы — ад мінус 6 да 1 цяпла, удзень — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Такі тэмпературны фон у гэтыя дні лютага прыкладна на 2—4 градусы вышэйшы за кліматычную норму.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Перасяленне

## ГОРАД ПУХНЕ

**Кожны пяты беларус жыве ў сталіцы. У краіне захоўваецца ўстойлівая тэндэнцыя адтоку насельніцтва з усіх абласцей у Мінск**

**ТАКСАМА назіраецца прыток насельніцтва з іншых абласцей у Мінскую, якая губляе людскі рэсурс толькі ў абмене са сталіцай. Магілёўская вобласць мае адмоўнае сальда міграцыі ў абмене насельніцтвам з іншымі абласцямі, такая ж сітуацыя назіраецца і ў Брэсцкай вобласці, якая атрымлівае насельніцтва толькі пры абмене з Магілёўшчынай. Найбольш актыўна такі абмен адбываецца паміж суседнімі абласцямі, скажам, паміж Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай.**

Як паведамляе Рэсурсны цэнтр ЮНФПА, больш за 80 працэнтаў міграцыйнага прыросту Мінска прыпадае на 15-19-гадовых, якія імкнуцца папоўніць шэрагі сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, размешчаных, у асноўным, у сталіцы. А вось самая высокая колькасць тых, хто выбывае з Мінска — 20-24-гадовыя, якія вяртаюцца «дадому», адпраўляюцца на самастойны пошук працы або накіроўваюцца ў рэгіёны па абавязковым размеркаванні. Адпаведна ва ўсіх абласных цэнтрах захоўваецца адваротная сітуацыя: адток насельніцтва ва ўзросце 15-19 гадоў і прырост у 20-24.

Доля тых, хто прыбывае з горада ў вёску, пастаянна зніжаецца. Так, у 2010 годзе месца жыхарства ў межах Беларусі змяніла звыш 211 тысяч чалавек, і толькі 38 тысяч з іх пераехалі пры гэтым з гарадской мясцовасці ў сельскую. «Як мяркуецца, большасць мужчын, якія пераязджаюць у сельскую мясцовасць, вяртаюцца на малую радзіму пасля безвыніковага пошуку працы, а ў старэйшым працаздольным узросце адной з прычын міграцыі можа быць развод або страта працы, — кажа малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Юлія ПЯТРАКОВА. — Паколькі многія жанчыны да 25 гадоў выходзяць замуж, іх мабільнасць зніжаецца, а з улікам таго, што жаночых прафесій, якія добра аплачваюцца, у сельскай мясцовасці менш, чым мужчынскіх, то і паток жанчын-мігрантаў у сельскую мясцовасць ніжэйшы».

❍Больш за 90 працэнтаў адміністрацыйных раёнаў Беларусі страчваюць насельніцтва.

❍Колькасць насельніцтва Мінска на 30 працэнтаў перавышае колькасць самай населенай вобласці Беларусі — Гомельскай.

❍74 працэнты жыхароў краіны жывуць у гарадах. Гэта самы высокі паказчык на постсавецкай прасторы. Такі ж узровень урбанізацыі ў Чэхіі і Швейцарыі. Толькі ў некаторых краінах Еўропы насельніцтва імкнецца жыць паблізу вялікіх гарадоў і ў сельскай мясцовасці. Доля гарадскога насельніцтва за апошнія гады знізілася ў Андоры, Люксембургу і Славеніі.

❍Рост гарадоў у нашай краіне, паводле прагнозаў, дасягне піка ў 2020 годзе, калі на гарадскіх тэрыторыях будзе пражываць 7 млн 219 тыс. чалавек.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### УВОД ЖЫЛЛЯ Ў СТУДЗЕНІ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ ЎДВАЯ

**У Беларусі ў студзені 2012 года ўведзена ў эксплуатацыю 376,9 тыс.кв.м агульнай плошчы жылля (9 працэнтаў задання на год), што ў два разы больш за аналагічны перыяд 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, за гэты перыяд уведзена ў эксплуатацыю 260,1 тыс.кв.м агульнай плошчы, або 69 працэнтаў ад агульнай колькасці ўведзенага жылля. У параўнанні са студзенем 2011 года ўвод жылля ў эксплуатацыю для гэтай катэгорыі грамадзян павялічыўся на 165,8 тыс.кв.м, або ў 2,8 раза.

У сельскіх населеных пунктах за студзень 2012 года ўведзена ў эксплуатацыю 80,3 тыс.кв.м агульнай плошчы жылля, або 21,3 працэнта агульнага ўводу па рэспубліцы (у студзені 2011 года — 33,8 працэнта).

### АБРАНЫ АФІЦЫЙНЫ ТУРАПЕРАТАР ХАКЕЙНАГА ЧС-2014

**Афіцыйным тураператарам чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, які пройдзе ў Мінску, выбрана ДУ «ЦэнтрКурорт». Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства спорту і турызму.**

Такое рашэнне прыняла камісія па вызначэнні турыстычнага апарата пад старшынствам намесніка міністра спорту і турызму Беларусі Часлава Шульгі. Акрамя ДУ «ЦэнтрКурорт», у конкурсе ўдзельнічалі ТАА «Вакол свету», ТАА «Топ-Тур» і УП «Беларустурыст».

Асацыяцыя «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь» плануе таксама разгледзець магчымасць супрацоўніцтва з прайграўшымі ў конкурсе турыстычнымі кампаніямі ў якасці партнёраў афіцыйнага турыстычнага аператара чэмпіянату свету па хакеі 2014 года.

### ЖАНЧЫНА «ЗДАЛА» СТАЛІЧНУЮ КВАТЭРУ АДРАЗУ 10 АРАНДАТАРАМ

**32-гадовая віцябчанка «здала» чужую сталічную кватэру адначасова 10 ахвотным, атрымаўшы за дзень больш за 1,5 тысячы долараў. Сваю кватэру ў Віцебску, дзе яна жыла з дзецьмі, махлярка ўмудрылася гэтак жа «здаць» 25 наймальнікам, атрымаўшы 21 мільён.**

— Я знайшла ў інтэрнэце аб'яву аб здачы кватэры на вуліцы Прытыцкага. Кошт быў прымальны — 160 долараў, і я патэлефанавала, а потым сустрэлася з Юліяй, якая назвалася гаспадыняй кватэры, — расказвае 24-гадовая Кацярына, якая пацярпела ад махляркі. — Юлія сказала, што гэта кватэра яе мужа, здаецца на доўгі тэрмін, і праз тыдзень я магу пераязджаць. Мяне ўсё задаволіла, я аддала ёй 160 долараў. Мы дамовіліся, што на наступным тыдні я прыеду па ключы, а Юлія папрасіла прывезці адразу грошы і за наступны месяц.

Толькі па ключы Кацярына выпадкова прыйшла на дзень раней прызначанай сустрэчы. І здзівілася, што дзверы ніхто не адчыніў. А потым кансьержка расказала дзяўчыне, што гэтая кватэра ніколі не здавалася на доўгі тэрмін, а толькі на суткі. На сустрэчу з Юліяй у прызначаны дзень Кацярына прыйшла з аператыўнікам.

— Высветлілася, што віцябчанка прыехала ў Мінск і, зняўшы гэту кватэру на суткі, тут жа пераздала яе 10 ахвотным, якія патэлефанавалі па аб'яве ў інтэрнэце, — расказвае прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС Мінска Ала Галубовіч. — Здзіўляе бесклапотнасць здымшчыкаў, бо ніхто з іх не спытаў у «гаспадыні» ні дакументаў на кватэру, ні хаця б пашпарт. Падчас праверкі высветлілася, што жанчына гэтак жа за 2011 год здала кватэру, у якой сама пражывала з дзецьмі, 25(!) чалавекам. Свае апошнія махлярствы Юлія тлумачыць фінансавымі праблемамі — у Мінск яна прыехала, каб зарабіць і пакрыць урон тым, каму «здавала» кватэру ў Віцебску.

Маладая жанчына знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, у яе двое дзяцей і, як сама яна патлумачыла, праблемы з мужам. Справа па віцебскіх махлярствах знаходзіцца ў судзе, а жанчына была пад падпіскай аб нявыездзе. Цяпер яна затрымана і змешчана ў следчы ізалятар.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### «РАЗВЁЎ» НА КРЭДЫТ

**Падчас расследавання крымінальнай справы, заведзенай летась, стала вядома, што непрацуючы, раней судзімы 53-гадовы мазыранін шляхам падману і злоўжывання даверам схіліў непрацуючую 43-гадовую жанчыну, каб яна атрымала ў банку крэдыт на спажывецкія патрэбы.**

Для гэтага мужчына зрабіў і падаў у банк фіктыўную даведку пра месца працы і сярэднямесячны заробак жанчыны. «Дакумент» засведчыў сваім подпісам і пячаткай прыватнага прадпрыемства, дырэктарам якога ён з'яўляўся раней. Крэдытны дагавор быў заключаны на Br7 млн, якімі грамадзянін і завалодаў. Пры гэтым ён не меў намеру выконваць абавязкі па пагашэнні крэдыту. Цяпер махляр арыштаваны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## МОВА-МАЦІ

**СВЕТ мяняецца вельмі хутка. Хутка мяняецца жыццё. Мяняецца чалавек — хоча быць вельмі сучасным, таму аддае перавагу прагматычнаму шляху. Але ён усё роўна застаецца чалавекам: любіць сваю маці, бацьку, родных, любіць тыя мясціны, дзе утульна душы, любіць, калі яму гавораць добрыя словы... Бяда, калі чалавек губляе блізкіх: дрэнна ў чалавека на душы, калі яна не мае таго прыстанку, дзе можа адпачыць ад клопату: сумна, калі ніхто не можа сказаць добрага слова, якое можа падтрымаць у цяжкі момант і натхніць. Страта хоць бы аднаго са складнікаў душэўнага свету адымае крупінку цябе самога. Што казаць пра народ, для якога словы — нібыта код, у якім зашыфравана сама сутнасць існавання, сэнс існавання ў гэтым свеце. І як кажуць, што людзі бяруць у спадчыну ад бацькоў пэўныя рысы, якія вызначаюць лёс, то і народы маюць спадчыну, якая сведчыць пра іх адметнасць і годнасць. І як годнасць асобнага чалавека выяўляецца праз яго адносіны да бацькоў, гэтак жа і годнасць народа — у яго павазе да мовы-маці. Як добрая маці, яна не асудзіць, яна ўсё даруе, але да самага апошняга будзе чакаць, што дзеці рана ці позна звернуцца да бацькоўскай мудрасці.**

**Пра гэта сёння, у Міжнародны Дзень роднай мовы, мы і прапануем паразважаць.**

СТАР. 4

## ДУШОЙ І СЛОВАМ — БЕЛАРУС!

### Прафесар Міхаіл ЦІКОЦКІ ўчора адзначыў 90-гадовы юбілей

***Выдатны беларускі мовазнавец і журналіст, доктар філалагічных навук Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі — чалавек рускі па паходжанні, але беларус — па духу.***

Аднойчы ўдакладніла ў прафесара: вашы карані ў Пецярбургу? Ён адказаў досыць рэзка: «Гэта няважна! Хоць карані мае сапраўды расійскія, душой я беларус. І словам — беларус!» Невыпадкова ўсё жыццё ён вывучае сугучнасць слоў жывых сваёй РОДНАЙ беларускай мовы.

Ён нарадзіўся ў сям'і Яўгена Карлавіча Цікоцкага — вядомага кампазітара, народнага артыста СССР, аднаго з заснавальнікаў прафесійнай музычнай творчасці ў Беларусі. Па бацькавым шляху не пайшоў, бо з дзяцінства была велізарная цікавасць да слова, яшчэ хлапчуком пісаў вершы і нават паэмы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ён скончыў школу ў 1941 годзе, на 22 чэрвеня быў прызначаны выпускны баль. Але... свой «чорны баль» распачала вайна. Два гады — у акупацыі. У 1943-м удалося звязацца з партызанамі: Любанскі раён, востраў Зыслаў. Потым на самалёце сям'ю вядомага кампазітара Цікоцкага перапраўлі ў Маскву. Адтуль пайшоў на фронт. Ваяваў на 1-м, 2-м і 3-м Беларускіх франтах. Дайшоў да Кёнігсберга. Быў паранены... Сярод шматлікіх узнагарод самыя дарагія — два медалі «За адвагу». Узнагароды гэтыя даваліся толькі за баявыя дзеянні...

Пасля вайны паступіў на аддзяленне журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Вучыўся і паралельна працаваў у газеце «Савецкі селянін», потым у «Калгаснай праўдзе», супрацоўнічаў з «Вожыкам».

Міхаіл Цікоцкі — у ліку заснавальнікаў школы беларускай стылістыкі, аўтар прац па вывучэнні мовы нашых класікаў — Я. Коласа, Я. Купалы, К. Чорнага, М. Лужаніна, У. Караткевіча, І. Мележа... Грунтоўна займаўся стылістыкай публіцыстычных жанраў.

Больш як паўвека прафесар Міхаіл Цікоцкі выкладаў на факультэце журналістыкі БДУ. Не адно пакаленне журналістаў з удзячнасцю ўспамінае яго ўнікальныя моўныя ўрокі.

Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі ўзнагароджаны знакам «Заслужаны работнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта». Днямі гэтую ганаровую ўзнагароду прафесару ўручылі дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей Дубовік і загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Віктар Іўчанкаў.

23 лютага ў Інстытуце журналістыкі пройдзе Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Жыццём і словам прысягаючы...», прысвечаная 90-годдзю доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіла Яўгенавіча Цікоцкага.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.02.2012 г. (для б/н разлікаў) | | |
| --- | --- | --- |
| ▼ 1 долар ЗША ........ 8 240,00 | 1 чэшская крона ........ 435,73 | |
| ▲ 1 еўра ........ 10 880,00 | 1 польскі злоты ........ 2 604,09 | |
| 1 латвійскі лат ........ 15 567,73 | ▼ 1 расійскі рубель ........ 277,00 | |
| 1 літоўскі літ ........ 3 149,06 | 1 украінская грыўня ........ 1 026,85 | |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
| --- | --- |
| USD | 29,7805 |
| 10 UAH | 37,1115 |
| 10000 BYR | 36,0103 |
| EUR | 39,3311 |

Ёсць пытанне

# ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ СТАРЫХ БУДЫНКАЎ

## Сёння абуза — заўтра выгада?



**На рабочым стале намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра РУСАНАВА — папка з пералікам і каляровымі ілюстрацыямі розных будынкаў. Гэта не прыватнае захапленне Аляксандра Георгіевіча архітэктурнымі стылямі, а адзін з яго цяперашніх прыярытэтаў у працы. Практычна ўсе гэтыя аб'екты, так бы мовіць, далёка не першай маладосці і сёння па розных прычынах эфектыўна не выкарыстоўваюцца, сталі абузай для гарадской інфраструктуры. Хаця быццам і знаходзяцца ў «казырным» месцы, якім з'яўляецца гістарычны цэнтр горада над Нёманам.**

**І тым не менш, нешта не відаць чаргі з ахвотных стаць гаспадарамі гэтых аб'ектаў. Чаму?**

— Так, іх месцазнаходжанне сапраўды даволі выгаднае, прэстыжнае, — згодны Аляксандр Русанаў. — Аднак галоўная праблема, напэўна, у тым, што практычна адсутнічаюць камунікацыі і зямельныя ўчасткі побач з гэтымі будынкамі. Пагадзіцеся, калі ўзяць будынак, дапусцім, пад гандлёвы цэнтр, але да яго няма пад'езду, няма месца для паркоўкі аўтамабіляў, то сітуацыя даволі праблематычная. Пакупнікі аддаюць перавагу тым аб'ектам, да якіх можна пад'ехаць ледзь не пад самыя дзверы.

А другая адметнасць размешчаных у гістарычным цэнтры будынкаў у тым, што многія з іх (амаль палова з вышэйзгаданага пераліку) з'яўляюцца помнікамі архітэктуры. І, каб правесці іх мадэрнізацыю, рэканструкцыю, патрэбен дазвол Міністэрства культуры. Трэба сфатаграфаваць ледзь не кожную цаглінку і потым аднавіць гэта ў першапачатковым выглядзе. Зразумела, што такія ўмовы больш праблематычныя з пункту гледжання арганізацыйных клопатаў і, галоўнае, фінансавых выдаткаў у параўнанні з новым будаўніцтвам. На праектна-каштарысную дакументацыю і рэканструкцыю можа спатрэбіцца сума, у дзясяткі разоў большая за затрачаную на пакупку аб'екта.

Дык ці ёсць магчымасць надаць старым будынкам у гістарычным цэнтры Гродна другое жыццё?

— Складанасці, з якімі мы сутыкнуліся падчас продажу гэтых аб'ектаў (для продажу альбо здачы ў арэнду з наступным выкупам прапануецца каля 20 аб'ектаў у цэнтры горада), прымусілі нас зрабіць вельмі падрабязнае апісанне кожнага з іх. Бачыце, да кожнай выявы будынка прыкладаецца інфармацыя: што ўяўляе сабой першы паверх, у якім стане другі, — расказвае Аляксандр Русанаў.

***— Добра, апісанне аб'ектаў зрабілі. Але што далей?***

— На першым этапе мы прапанавалі купіць гэтыя будынкі нашым вядучым, горадаўтваральным, прадпрыемствам для развіцця сваёй сацыяльнай сферы. Каб там былі перш за ўсё кавярні, гасцініцы, іншыя аб'екты сэрвісу, пры неабходнасці — офісныя памяшканні. Зразумела, для гэтага суб'екту гаспадарання патрэбна ўзгадненне з больш высокай арганізацыяй, трэба патлумачыць, навошта яму патрэбна тая ж кавярня. Такія ўзгадненні ідуць, прама скажу, цяжкавата. Аднак некаторыя ў гэты працэс уключыліся вельмі актыўна, і ўжо ёсць першыя вынікі. Напрыклад, «Скідальаграпрадукт» набыў з аўкцыённых таргоў будынак на вуліцы Калючынскай для яго рэканструкцыі пад кавярню.

Другім этапам мы хацелі б прыцягнуць да гэтай справы прадпрыемствы сярэдняга і буйнога прыватнага бізнэсу. Просім іх падтрымаць горад, каб гэтыя аб'екты былі задзейнічаны ў гаспадарчым абароце. Дарэчы, больш ахвоты праяўляюць менавіта тыя, хто ўжо мае аб'екты сацыяльнай накіраванасці — гандлю, грамадскага харчавання. І сапраўды, чаму мець толькі па адным, а не па два, тры такія аб'екты? Зыходзячы нават з таго, што чым больш іх будзе — тым ніжэй затраты на іх утрыманне.

Якія стымулы ёсць для таго, каб у неперспектыўных сёння аб'ектаў з'явіліся новыя ўласнікі? Адна з важных прэферэнцый — гэта беспрацэнтная субсідыя пад стварэнне працоўных месцаў. Яна можа дасягаць каля 25-30 мільёнаў рублёў на кожнае месца, і праз тры гады вяртаецца толькі гэтая сума. Акрамя таго, з абласнога бюджэту дадаткова выдзелена 20 мільярдаў рублёў на фінансаванне праектаў малога бізнэсу. Гэтыя грошы размяшчаюцца на банкаўскія дэпазіты з наступным прадастаўленнем ільготных крэдытаў суб'ектам прадпрымальніцтва. Неабходную інфармацыю па гэтых пытаннях можна атрымаць у Гродзенскай абласной установе фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў.

На жаль, прыкладна за год на мэты развіцця таго ці іншага прадпрыемства малым бізнэсам было ўзята толькі крыху больш за 1 мільярд рублёў. Не хапае адпаведных праектаў?

Што ж датычыцца ўдзелу малога прадпрымальніцтва ў задзейнічанні будынкаў у гістарычным цэнтры Гродна, то праблема не столькі ў адсутнасці ідэй, колькі ў цяперашняй неадпаведнасці магчымасцяў гэтай катэгорыі бізнэсу (нават з улікам бюджэтнай падтрымкі) рэальнаму кошту пытання.

— За межамі абласнога цэнтра мы сёння маем права прадаваць аб'екты па цане ад адной базавай велічыні, і гэта дало моцны штуршок для іх задзейнічання ў гаспадарчым абароце, — зазначае Аляксандр Русанаў. — Больш за тое, мы можам аддаваць аб'екты пад канкрэтныя інвестыцыйныя праекты бясплатна. Складаецца бізнэс-план пад, умоўна кажучы, кавярню, і гэты будынак аддаецца вам у карыстанне на тры гады. І праз пэўны тэрмін (згодна з бізнэс-планам), калі ўсё выконваецца, вы становіцеся яго ўласнікам.

А вось у Гродне пакуль у гэтым пытанні, так бы мовіць, звязаны рукі. Па шэрагу аб'ектаў у гістарычным цэнтры праводзіцца шмат аўкцыёнаў, аднак паніжаць цану да адной базавай велічыні права няма. І калі нашы цяперашнія крокі па заахвочванні цікавасці суб'ектаў гаспадарання, малога бізнэсу ў гэтых аб'ектах будуць недастатковымі, то, мяркую, вышэйзгаданыя «правілы гульні» павінны быць на заканадаўчым узроўні ўстаноўлены і для г. Гродна. Тым больш што ў вобласці ёсць прыклады, калі, пачынаючы і ад адной базавай велічыні, аб'екты прадаваліся за 50, 100 і больш мільёнаў рублёў. Напрыклад, у Мастах была ўжо думка знесці адзін з будынкаў, аднак вырашылі прадаць яго на ўмовах ад адной базавай велічыні. І атрымалі ў выніку 58 мільёнаў рублёў. Цяпер там створаны шэраг прадпрыемстваў сферы паслуг.

***— А ці рэальна прыцягнуць дзеля адраджэння будынкаў гістарычнага цэнтра Гродна замежныя інвестыцыі?***

— Актыўна займаемся і гэтай тэмай. Сёлета на Гродзеншчыне запланавана прыцягнуць 129 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый. Лічба цалкам рэальная, бо ўзгоднена з канкрэтнымі праектамі. Пры гэтым замежны бізнэс больш актыўна ідзе ў вытворчую сферу, а вось сфера паслуг яго пакуль асабліва не цікавіць. Адна з праблем, на мой погляд, — у даволі працяглым тэрміне абавязковай адаптацыі праекта, які зроблены за мяжой, да нашых умоў. Мяркую, трэба ўносіць нейкія папраўкі ў нашы заканадаўчыя нарматывы ў сферы архітэктурна-будаўнічай дзейнасці, каб гэты тэрмін скараціць.

Іншы бок «медаля» — адказнасць інвестара. Чаму з'яўляюцца даўгабуды? Аляксандр Русанаў лічыць, што сёння мы пажынаем плады ранейшай недасканаласці заканадаўства, калі аб'екты (а гэта былі так званыя «смачныя кавалкі») прадаваліся, па сутнасці, без умоў.

— Сёння ж у дагаворах у абавязковым парадку агаворваецца не толькі ўмова па тэрміне ўводу аб'екта ў эксплуатацыю, але і прадугледжваюцца штрафныя санкцыі (пеня) за пратэрміноўку. Гэта дысцыплінуе інвестараў. І я не скажу бы, што сапраўдных інвестараў гэта пужае, насцярожвае, — зазначае Аляксандр Русанаў.

**P.S.** ***Калі гэты артыкул быў падрыхтаваны да друку, карэспандэнту «Звязды» стала вядома аб канкрэтных кроках па аднаўленні будынкаў у гістарычным цэнтры Гродна. Паводле інфармацыі старшыні гарадскога Савета дырэктара Анатоля Грышука, рэальны шанц набыць новых гаспадароў з'явіўся ў 15 аб'ектаў. Дзяржаўным прадпрыемствам яны могуць перадавацца з балансу на баланс. У асноўным жа пасля рынавай ацэнкі будынкі будуць выстаўляцца на аўкцыён, прычым ужо ёсць абяцанне канкрэтных суб'ектаў гаспадарання на ўдзел у таргах па тых ці іншых аб'ектах. Шмат ахвотных не прадбачыцца, і, калі не з'явяцца іншыя прэтэндэнты, гэтыя прадпрыемствы, верагодна, і стануць новымі ўласнікамі будынкаў у гістарычным цэнтры горада над Нёманам.***

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Рынак працы

# МЕСЦА... БЕЗ ЧАЛАВЕКА?

**УЛАДКАВАЦЦА на працу ў буйным горадзе ёсць магчымасць, хоць не ўсе прафесіі запатрабаваны. Напрыклад, цяжка знайсці месца юрыстам, эканамістам, псіхолагам... Больш складаная сітуацыя ў невялікіх райцэнтрах і сельскай мясцовасці, дзе прадпрыемстваў не так шмат.**

Раёны Брэстчыны можна падзяліць на дзве катэгорыі. Да першай адносяцца тыя, дзе колькасць свабодных працоўных месцаў перавышае колькасць зарэгістраваных беспрацоўных, а да другой — раёны, у якіх ахвотных працаваць больш, чым вакансій. Напрыклад, на 1 студзеня гэтага года ў Пружанскім раёне вакансій было 249, а беспрацоўных — 163, у Маларыцкім — адпаведна 139 і 80, у Камянецкім — 203 і 73. Але ёсць шэраг раёнаў, у якіх усё наадварот. Вось у Іванаўскім вакансій 56, а беспрацоўных 171, у Жабінкаўскім — 26 і 60, у Ганцавіцкім — 114 і 147...

Ганцавіцкі раён у адпаведнасці з пастановай урада № 514 (ад 1 красавіка 1998 года) быў уключаны ў спіс раёнаў, якія «знаходзяцца ў дрэнных прыродна-кліматычных, экалагічных і эканамічных умовах». Такі раён на Брэстчыне адзіны. Ганцаўшчына вызначалася і самым высокім узроўнем беспрацоўя па краіне, напрыклад, у 2010 годзе ён дасягнуў 2,1 працэнта. У раёне няма буйных прадпрыемстваў, але стабільна працуе «Модуль», які выпускае трубы для жыллёва-камунальнай гаспадаркі. А яшчэ мэблевая фабрыка «Лагуна» з Баранавіч адкрыла тут свой філіял.

— Прадпрыемствам і арганізацыям раёна патрэбны электразваршчыкі, галоўныя інжынеры, кіроўцы, муляры, а колькасць вакансій прадаўцоў дасягнула ўжо 15, — кажа **начальнік аддзела раённага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароны Анатоль ВОЛЬНІЧ**. — У вёсцы Ганцавічы, якая знаходзіцца побач з райцэнтрам, працуе турфірма, дзе няма дырэктара. Гэтае крэсла не пуставала б, калі б не адна акалічнасць. Кіраўнік азначанай турфірмы павінен валодаць нямецкай і турэцкай мовамі. Увогуле, сёння запатрабаваны кваліфікаваныя спецыялісты. Нават качагары павінны мець кваліфікацыю, і мы іх рыхтуем. Дапамагаем ахвотным стаць прадпрымальнікамі: 8 чалавекам выдзелілі па 8 мільёнаў рублёў дзяржаўнай падтрымкі. Калі ў Агарэвічах прадпрымальнік заняўся дрэваапрацоўкай, то 35 чалавек атрымалі працу, яшчэ 10 беспрацоўных уладкаваліся ў горадзе.

Узровень беспрацоўя ў раёне сёння вагаецца ў межах 1,2 працэнта, на ўліку стаяць розныя катэгорыі насельніцтва: людзі, якім мала засталося да пенсіі, інваліды, тыя, хто не мае спецыяльнасці і адукацыі... І калі прадпрымальнікі свае праблемы вырашаюць самі, то ў дзяржаўным сектары і СВК рук, відавочна, не хапае, і тлумачыцца гэта невысокай зарплатай. Напрыклад, у ЖКГ горада патрэбны галоўны інжынер на зарплату 1,5 мільёна, у аўтапарку № 7 заробак яшчэ меншы. Вось спецыялісты і едуць на працу ў Расію. Колькі іх пакідае раён штогод, падлічыць цяжка.

— Мяжа з Расіяй адкрыта, таму назваць дакладную лічбу тых, хто там працуе, немагчыма, хоць збор звестак мы вядзём. Прасцей высветліць, хто выехаў з вёскі, бо там усё навідавоку, а вось у горадзе зрабіць гэта больш складана. Атрымліваецца, што людзі падаткі тут не плацяць, а сацыяльнымі паслугамі карыстаюцца, — лічыць Анатоль Мікалаевіч. — Хоць ёсць і плюс — грошы прывозяць. Але ж калі Адзіная эканамічная прастора і свабодная міграцыя працоўных рэсурсаў сталі рэчаіснасцю, то неабходна прымаць і адпаведныя законы, у межах якіх дзейнічалі б мігранты. Бо чалавек працуе ў Расіі, а лечыцца і пенсію атрымлівае тут.

Безумоўна, палешукі, якія нікуды не ад'язджаюць, і дома знаходзяць выйсце — не сядзяць склаўшы рукі. На ягадах насельніцтва мае добрыя грошы, на адных чарніцах ці журавінах сям'я можа зарабіць 10 мільёнаў за сезон. Нават два чалавекі здольны за месяц назбіраць ягад на 6 млн рублёў. Праца цяжкая, але нашаму чалавеку не прывыкаць.

А вось у Камянецкім раёне колькасць вакансій утрая перавышае колькасць ахвотных знайсці працу. Хоць тут (як і ў іншых раёнах) прадастаўляюць не толькі працу, але і жыллё. Але людзі ў першую чаргу хочуць атрымліваць добрую зарплату. Напрыклад, вядучаму ветэрынарнаму ўрачу ў ААТ «Каленкавічы» прапаноўваюць 1,9 млн рублёў. Няшмат, хоць ёсць гаспадаркі, дзе адпаведная зарплата значна ніжэй. У СВК «Агра-Ніва» трактарыстам-машыністам і аператарам машыннага даення прапаноўваецца заробак у 2,5 млн рублёў, але ж у большасці сельгаскааператываў пра такую зарплату толькі мараць. Заробак у 1-1,5 млн — звычайная для іх з'ява.

Калі жывёлавод атрымлівае 1 млн, а вядучаму заатэхніку на гэтым фоне абяцаюць 1,3 млн рублёў, то ажывіць рынак працы праблематычна. Такая зарплата да фінансавага абвалу была прымальнай, а сёння ўжо не. І сітуацыя з кадрамі ўскладняецца, бо ўсё больш кваліфікаваных спецыялістаў выязджае на працу ў Расію. У Баранавіцкім аўтапарку № 2 ужо ўзніклі сур'ёзныя праблемы з кіроўцамі, хоць зарплату па нашых мерках яны маюць неблагую.

Працоўныя месцы ёсць, беспрацоўе нашай краіне не пагражае. Па адной толькі Брэсцкай вобласці не хапае 169 урачоў, 181 медсястры, 427 вадзіцеляў, 232 швачак... Вядома, што лічбы гэтыя вагаюцца, але ў цэлым праблема застаецца. Відавочна, яе вырашэнне ў першую чаргу залежыць ад узроўню зарплаты. А яе трэба зарабіць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## 22 марта 2012 года проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Ждановичский с/с, п. Ратомка | Минский район, г. Заславль, ул. Береговая | Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Чкалова | Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Молокович | Минский район, Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Путейская | Минский район, Колодищанский с/с, д. Старина | Минский район, Крупицкий с/с, д. Дубицкая Слобода | Минский район, Крупицкий с/с, д. Пятевщина |
| 2 | Кадастровый номер | 623681708601002213 | 623650100001004474 | 623683403101007213 | 623683403101007035 | 623683403101007036 | 623683404101000358 | 623683903601000064 | 623683908101000359 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,8501 га | 0,1562 га | 0,0082 га | 0,0100 га | 0,0100 га | 0,0300 га | 0,0386 га | 0,7384 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 40 | 50 | 30 | 30 | 30 | 40 | 51 | 50 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства физкультурно-оздоровительного комплекса | Для строительства объекта физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения | Для установки церковного павильона | Для размещения торгового павильона | Для размещения торгового павильона | Для строительства магазина | Для размещения объекта торговли товарами народного потребления | Для строительства магазина строительных материалов с площадкой для их хранения |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей) | - | 233 310 | - | - | - | - | 630 300 | - |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 2 151 045 | 2 437 068 | 1 648 229 | 1 565 102 | 1 565 102 | 2 015 070 | 2 156 134 | 2 176 115 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 33 676,20 доллара США | 31 529,77 доллара США | 633,62 доллара США | 368 долларов США | 868 долларов США | 851,24 доллара США | 516 долларов США | 13 959,60 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 55 000 000 | 50 000 000 | 1 000 000 | 600 000 | 1 400 000 | 1 400 000 | 850 000 | 20 000 000 |

| | | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 | Лот 14 | Лот 15 | Лот 16 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Луговослободской с/с, д. Заболотье | Минский район, Луговослободской с/с, аг. Луговая Слобода | Минский район, Луговослободской с/с, аг. Замосточье | Минский район, Луговослободской с/с, д. Обчак | Минский район, Луговослободской с/с, аг. Замосточье | Минский район, Луговослободской с/с, п. Привольный | Минский район, Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи | Минский район, Новодворский с/с, д. Цесино |
| 2 | Кадастровый номер | 623684104601000192 | 623684108601000484 | 623684105101000474 | 623684109101000670 | 623684105101000476 | 623684109601000299 | 623655500001000303 | 623684307601000090 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,0020 га | 0,0025 га | 0,0030 га | 0,0030 га | 0,0050 га | 0,0060 га | 0,5004 га | 0,0300 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 30 | 30 | 30 | 30 | 30 | 30 | 51 | 40 |
| 5 | Целевое назначение | Для размещения торгового павильона | Для размещения торгового павильона | Для строительства торгового павильона | Для размещения торгового павильона | Для установки торгового павильона | Для строительства торгового павильона | Для строительства производственно-складских и технических сооружений для производства изделий медицинского назначения | Для строительства магазина |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей) | - | - | - | - | - | - | 8 487 405 | 2 076 120 |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 894 620 | 1 565 975 | 1 755 538 | 1 894 620 | 1 996 256 | 1 755 538 | 1 827 820 | 1 779 002 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 29 долларов США | 100 долларов США | 161,42 доллара США | 81,64 доллара США | 270,17 доллара США | 362,02 доллара США | 35 851,36 доллара США | 863,03 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 40 000 | 150 000 | 250 000 | 100 000 | 450 000 | 550 000 | 55 000 000 | 1 400 000 |

| | | Лот 17 | Лот 18 | Лот 19 | Лот 20 | Лот 21 | Лот 22 | Лот 23 | Лот 24 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Минский район, Острошицко-Городокский с/с, аг. Острошицкий Городок | Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Галица | Минский район, Папернянский с/с, д. Касынь | Минский район, Папернянский с/с, д. Дубовляны | Минский район, Петришковский с/с, д. Кривое Село | Минский район, Петришковский с/с, аг. Петришки | Минский район, Сеницкий с/с, район аг. Сеница | Минский район, Хатежинский с/с, д. Васьковщина |
| 2 | Кадастровый номер | 623685206101000980 | 623685202101000147 | 623685504101000286 | 623685503101000204 | 623685704601000137 | 623685707601000715 | 623686600001000379 | 623687501101000059 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,0401 га | 0,1200 га | 0,0098 га | 0,0498 га | 0,0303 га | 0,0400 га | 0,0100 га | 0,6254 га |
| 4 | Срок аренды (лет) | 40 | 50 | 30 | 40 | 30 | 30 | 3 | 50 |
| 5 | Целевое назначение | Для строительства магазина | Для строительства магазина | Для строительства торгового павильона | Для строительства СТО | Для строительства торгового павильона | Для строительства торгового павильона | Для размещения торгового павильона по продаже товаров народного потребления | Для строительства административно-складских помещений |
| 6 | Сумма убытков и потерь с/х, л/х производства (рублей) | - | 5 320 120 | 293 240 | 3 048 150 | - | 171 330 | - | 6 005 200 |
| 7 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 941 956 | 2 135 869 | 2 223 469 | 2 110 780 | 2 109 674 | 1 898 749 | 1 797 408 | 2 526 538 |
| 8 | Начальная цена права заключения договора аренды | 1 486,63 доллара США | 2 903,39 доллара США | 153,23 доллара США | 1 530,48 доллара США | 782,72 доллара США | 874,26 доллара США | 354,17 доллара США | 18 948,62 доллара США |
| 9 | Задаток (рублей) | 2 400 000 | 4 800 000 | 250 000 | 2 500 000 | 1 200 000 | 1 400 000 | 550 000 | 30 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **22.03.2012 г. в 10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **16.03.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3641000000223, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Карбышева, д. 13, к. 2, МФО 153001520, УНП 600068187, получатель – Минский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Документы, необходимые для участия в аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

Кроме того, в комиссию представляются:

• гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

• индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

• представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

• представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

• представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

• представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в аренду единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

# МОДНЫЯ ПАВОДЗІНЫ

## Сёння павінна вітацца любое беларускае маўленне

*(Пачатак у нумары за 17 лютага.)*

**Пра тое, як кожны сваім персанальным удзелам можа паспрыяць пашырэнню выкарыстання беларускай мовы, разважалі на «круглым стале», які быў прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы. У Беларусі гэтае свята мае свае асаблівасці, — прызналі ўдзельнікі. Працягваем абмеркаванне тэмы.**

*Аляксандр Лукашанец, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі:*

— Асноўная мэта Міжнароднага дня роднай мовы — падтрымка нацыянальных моў, культур, захаванне нацыянальнай адметнасці народаў, забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца ў сваёй дзейнасці роднай мовай. Для нашай краіны правядзення дня роднай мовы мае сваю адметнасць, што звязана са спецыфікай моўнай сітуацыі. Гэта спецыфіка заключаецца ў наступным: калі для большасці краін і народаў ідэя дня роднай мовы накіравана на падтрыманне моў нацыянальных меншасцяў, то для нашай краіны аб'ектам пільнай увагі ў гэты дзень становіцца беларуская мова — дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі. Таму што ў нас, нягледзячы на высокі заканадаўчы статус беларускай мовы, існуюць велізарныя праблемы з яе выкарыстаннем як рэальнага сродку зносін. Таму моўны вопыт Беларусі паказвае, што тыя праблемы, якія звычайна абмяркоўваюцца ў ходзе такіх мерапрыемстваў і такіх свят актуальныя нават для моў нацыянальных большасцей і моў з высокім заканадаўчым статусам.

Калі гаварыць па праблемы існавання беларускай мовы ў сучасным грамадстве, то на сённяшні дзень трэба адрозніваць два аспекты. Першы: узровень развіцця сістэмы мовы, і яе становішча як сродку зносінаў у грамадстве. Калі гаварыць пра сістэму беларускай мовы, то я павінен сказаць, што беларуская мова сёння — гэта высокаразвітая літаратурная мова, якая можа паспяхова абслугоўваць усе патрэбы жыцця сучаснага грамадства, яна можа выкарыстоўвацца ва ўсіх сферах, ад папытавай да сферы высокіх камп'ютарных тэхналогій.

Па-другое: сёння сістэма беларускай мовы развіваецца ў рэчышчы тых агульных тэндэнцый, якія вызначаюць сучаснае развіццё ўсіх славянскіх моў. Гэта таксама гаворыць пра тое, што яна знаходзіцца ў кантэксце сусветнага моўнага працэсу. І цікавы момант, што нягледзячы на праблемы з яе выкарыстаннем у большасці афіцыйных сфер ужытку беларуская мова сёння рэальна пранікае ў тыя сферы, у якіх яе ў папярэдні перыяд не было. Перш за ўсё сфера інтэрнэт-камунікацый, прафесійная сфера, дзе беларуская мова выкарыстоўваецца як рэальны сродак зносін. Сёння беларуская мова рэальна запатрабаваная і мае тэндэнцыю да пашырэння ў многія сферах.

Што трэба рабіць, каб яна заняла тое месца, якое павінна займаць? Па-першае, неабходна строгае выкананне дзяржаўнага заканадаўства ў моўнай сферы. Я маю на ўвазе канстытуцыю, дзе сказана, што беларуская мова з'яўляецца дзяржаўнай мовай краіны. Гэта закон аб мовах Рэспублікі Беларусь, у якім прапісаны правы грамадзян у сферы моўнага жыцця. Гэта выкананне плана, які прапанавала Міністэрства культуры. Неабходна павышаць беларускамоўную кампетэнцыю нашага грамадства. І гэта ў першую чаргу задача сістэмы адукацыі. Я неаднаразова гаварыў, што сёння сістэма сярэдняй адукацыі з'яўляецца тым галоўным дзяржаўным інстытутам, які падтрымлівае беларускамоўную кампетэнцыю беларускага грамадства. Часта многія дарослыя грамадзяне нашай краіны з беларускай мовай знаёмяцца ў школе і атрымліваюць навыкі яе практычнага карыстання.

*Першы намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш Стружэцкі:*

— Сапраўды, беларуская мова — адзін з важнейшых складнікаў беларускай культуры, адметнага фарміравання яе этнічных рысаў. Калі быць больш канкрэтным, магу сказаць, што сёння для Міністэрства культуры, як і для большасці арганізацый культуры моўнай праблемы не існуе. Іншая справа як шырока яна выкарыстоўваецца ў розных сферах. Так, спецыфічная дзейнасць Міністэрства культуры скіравана на падтрымку і папулярызацыю беларускай мовы. Магу тут пацвердзіць канкрэтнымі прыкладамі: уся заканадаўчая і нарматыўная база ў сферы культуры распрацаваная і прынята на беларускай мове. Справаводства ў Міністэрстве культуры вядзецца на беларускай мове. У выпадках, калі да нас звяртаюцца на рускай мове з улікам двухмоўя мы вядзём перапіску, перамовы, сустрэчы на рускай мове. Але для нас гэтай праблемы няма. Хоць ёсць супрацоўнікі, якія слаба валодаюць беларускай мовай. Важны для гэтага праект разам з Міністэрствам інфармацыі «Год кнігі». Мы падтрымалі ідэю аб распрацоўцы нацыянальнай праграмы чытання.

Ёсць праблема псіхалагічнага плана, што многія не спрабуюць адаптавацца ў канкрэтную рэальную сітуацыю. Практычна абсалютная большасць валодае беларускай мовай, гатовыя яе ўжываць, але ў канкрэтнай сітуацыі не гатовыя ёй карыстацца. Думаю, што гэта агульная праблема нашага грамадства. Беларуская мова павінна пастаянна гучаць у сродках масавай інфармацыі, па радыё, тэлебачанні, ёй павінны карыстацца кіраўнікі розных узроўняў. І калі толькі старшыня райвыканкама на пасяджэнні райвыканкама загаварыў на беларускай мове, дзе абмяркоўваецца пытанне культуры, адразу ўсе выступоўцы хуценька перайшлі на беларускую мову і не ўзнікае праблем. Мы павінны даваць стымулы, якія будуць падштурхоўваць людзей карыстацца беларускай мовай.

*Аляксандр Лукашанец:*

— ...Як мінімум адна беларускамоўная школа, як мінімум адзін беларускамоўны садок павінен быць у кожным раёне. Гэта складаная справа для вырашэння, патрабуе працяглага часу. Але трэба гаварыць пра строгае выкананне існуючага заканадаўства, таму што ў межах яго ўсё гэта можа вырашацца. Тады і да рэкламы адпаведны падыход: 50 % рэкламы павінна быць на дзяржаўнай мове. Часта дзейнічаюць стэрэатыпы моўных паводзін. Змена паводзін патрабуе часу.

Для сучаснай моўнай сітуацыі важна, што сёння мова павінна стаць фактарам кансалідацыі беларускага грамадства, а не фактарам канфрантацыі. Гэта значыць, што сёння павінна вітацца любое беларускамоўнае маўленне. Мы павінны разумець, ёсць сферы, дзе можа выкарыстоўвацца тая ці іншая мова, і ёсць сферы, дзе абавязкова павінна выкарыстоўвацца толькі беларуская літаратурная мова. Гэта сфера навучання, гэта афіцыйныя сферы ўжытку. Калі ўсе гэтыя моманты будуць выконвацца, то беларуская мова ў XXI стагоддзі не толькі застанецца важнейшым фактарам беларускай нацыянальнай культуры, але і пашырыць свае функцыі як рэальны сродак камунікацыі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# МОВА Ў КАНТЭКСЦЕ ГУМАНІТАРНАЙ БЯСПЕКІ КРАІНЫ

**Міжнародны дзень роднай мовы з'яўляецца добрай нагодай, каб паразважаць аб ролі і месцы акадэмічнай мовазнаўчай навукі ў сістэме гуманітарных ведаў і нацыянальнай навукі ўвогуле, аб задачах і прыярытэтах акадэмічнай і ўніверсітэцкай лінгвістыкі. Актуальнасць такой пастаноўкі пытання абумоўлена шырока абмяркоўваемай на ўсіх узроўнях праблемай рэарганізацыі беларускай навукі ў цэлым і акадэмічнай навукі ў прыватнасці, а таксама вызначэннем месца і ролі гуманітарных навук у сістэме нацыянальнай навукі.**

Варта адразу падкрэсліць, што сёння існуе трывалая навуковая і фактaлагічная база для паспяховага функцыянавання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, у якіх павінна выкарыстоўвацца дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі. І такая база створана перш за ўсё ў акадэмічным Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы, які з'яўляецца адзінай у краіне навукова-даследчай установай, што забяспечвае правядзенне сістэмных даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства. Ні адна з існуючых у Беларусі ўстаноў, у тым ліку і універсітэцкія мовазнаўчыя кафедры, не ў стане вырашаць тыя надзённыя навуковыя праблемы беларускага мовазнаўства, якія паспяхова вырашаюцца ў Інстытуце мовы і літаратуры.

Такое становішча абумоўлена не толькі традыцыяй, але і існуючым размежаваннем прыярытэтаў акадэмічнага і ўніверсітэцкага мовазнаўства.

Па-першае, гістарычна асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства сфарміраваліся ў Акадэміі навук і накіраваны на забеспячэнне моўнай сферы жыцця беларускага грамадства.

Па-другое, у акадэмічным Інстытуце мовазнаўства склаліся нацыянальныя навуковыя школы і маецца неабходная навуковая база для правядзення даследаванняў на ўзроўні сучасных міжнародных стандартаў.

Па-трэцяе, тэматыка навуковых даследаванняў інстытута фарміруецца ў адпаведнасці з агульнадзяржаўнымі прыярытэтамі, а не падпарадкавана асабістым навуковым інтарэсам даследчыкаў, што ў значнай ступені ўласціва ўніверсітэцкаму мовазнаўству.

Па-чацвёртае, у інстытуце праведзены шырокамаштабныя даследаванні сістэмы беларускай мовы і падрыхтаваны фундаментальныя працы (акадэмічныя граматыкі; разнастайныя слоўнікі беларускай мовы, у тым ліку перакладныя беларуска-рускія і руска-беларускія; манаграфічныя працы), якія забяспечылі беларускай мове статус высокаразвітой славянскай мовы.

Па-пятае, у інстытуце працягваецца работа над фундаментальнымі працамі (шматтомныя Гістарычны і Этымалагічны слоўнікі беларускай мовы, Агульнаславянскі лінгвістычны атлас — буйнейшы міжнародны славістычны праект XX — XXI стст. і інш.), якія маюць агульнадзяржаўнае навуковае і культурнае значэнне і забяспечваюць міжнародны прэстыж беларускай лінгвістычнай навукі.

Па-шостае, інстытутам у рамках выканання дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» ў адпаведнасці з сучаснымі гуманітарнымі прыярытэтамі распрацоўваюцца заданні, накіраваныя на даследаванне сістэмы сучаснай беларускай мовы і тэндэнцый яе развіцця на сучасным этапе, на супастаўляльнае апісанне дзяржаўных беларускай і рускай моў, вывучаюцца аспекты беларуска-славянскага моўнага ўзаемадзеяння, распачата праца па стварэнні новага шматтомнага тлумачальнага слоўніка, у якім будзе прадстаўлена лексіка беларускай мовы пачатку XXI ст.

Па-сёмае, акадэмічны Інстытут мовы і літаратуры адыграў выключную ролю ў выпрацоўцы адзіных правапісных норм, без якіх немагчыма функцыянаванне беларускай пісьмовай мовы перш за ўсё ў афіцыйных сферах ужытку і сістэме адукацыі. Так, менавіта ў інстытуце былі падрыхтаваны «Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (Мн., 1959), якія больш чым на паўстагоддзя забяспечылі адзінства беларускай пісьмовай мовы. Супрацоўнікі інстытута былі асноўнымі распрацоўшчыкамі новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, а таксама Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (прыняты ў 2008 годзе, уведзены ў дзеянне з 1 верасня 2010 года). У апошнія гады ў інстытуце падрыхтавана серыя навуковых прац і практычных даведнікаў, якія забяспечваюць патрэбы сучаснай моўнай практыкі і накіраваны на выкананне дзяржаўнага заканадаўства ў моўнай сферы.

Па-восьмае, падрыхтаваныя ў інстытуце працы з'яўляюцца надзейнай тэарэтычнай і фактaлагічнай базай вучэбнай літаратуры па беларускай мове для ўсіх узроўняў адукацыі.

Па-дзявятае, акадэмічны Інстытут мовы і літаратуры пастаянна выступае незалежным экспертам вучэбных праграм і вучэбнай літаратуры па беларускай і рускай мовах для агульнаадукацыйных устаноў і ВНУ краіны.

Па-дзясятае, сёння акадэмічнае мовазнаўства не залежыць ад ведамасных і карпаратыўных інтарэсаў, свабоднае ад палітычных і ідэалагічных уплываў і падпарадкавана агульнадзяржаўным і агульнанацыянальным прыярытэтам.

Усё гэта рэальна забяспечвае патрэбы сучаснай моўнай практыкі, адукацыйны працэс і гуманітарную бяспеку Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе яе незалежнасці.

Неабходна таксама падкрэсліць, што дзейнасць універсітэцкіх мовазнаўчых кадраў зараз у асноўным накіравана на забеспячэнне навучальнага працэсу і падрыхтоўку вучэбнай літаратуры, што не прадугледжвае ў прынцыпе самастойнай навукова-даследчай дзейнасці, а грунтуецца на выніках іншых даследаванняў, у тым ліку і праведзеных Інстытутам мовы і літаратуры.

У Міжнародны дзень роднай мовы самая пільная ўвага павінна ўдзяляцца таксама праблеме захавання ў краіне навуковых падраздзяленняў і высокакваліфікаваных кадраў, якія павінны і могуць падтрымліваць стан нацыянальнай мовы краіны і яе функцыянаванне ў грамадстве. Пры той дыферэнцыяцыі акадэмічнай і ўніверсітэцкай мовазнаўчай навукі, што склалася ў папярэдні перыяд, перадача, напрыклад, Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ў сістэму Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь непазбежна прывядзе да разбурэння балансу паміж фундаментальнай і прыкладной навукай, страты цэлых навуковых напрамкаў, зніжэння прэстыжу беларускага мовазнаўства як у краіне, так і за яе межамі. Адмоўным вынікам такіх дзеянняў стане:

а) непазбежнае растварэнне нацыянальнай фундаментальнай лінгвістычнай навукі ў паўсядзённым адукацыйным працэсе;

б) узнікненне ў будучым праблем з навуковым і фактaлагічным забеспячэннем патрэб сучаснай моўнай практыкі, у тым ліку і адукацыйнага працэсу;

в) стварэнне дысбалансу ў захаванні сутнасці і прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя ў краіне;

г) фарміраванне ў вачах міжнароднай супольнасці негатыўнага іміджу Рэспублікі Беларусь як краіны, якая абыякава ставіцца да ўласных нацыянальна-культурных каштоўнасцей.

Усё сказанае сведчыць, што рэфармаванне сферы гуманітарнай навукі ў Беларусі павінна быць усебакова ўзважаным і ўлічваць прыярытэты гуманітарнага развіцця краіны.

**Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ,**
**дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.**

## Акцыя

### Класічная дыктоўка

**У Міжнародны дзень роднай мовы ёсць магчымасць праверыць веданне беларускай.**

Сёння першы этап Агульнанацыянальнай дыктоўкі. Акцыя, якую пяць гадоў назад ініцыявала Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, сёлета прысвечана юбілеям Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Танка.

Таму сёлета для дыктоўкі прапануюць тэксты Купалы і Танка. Першыя дваццаць удзельнікаў, якія напішуць абраны тэкст без памылак, атрымаюць памятныя ўзнагароды.

Гэта выдатная магчымасць праверыць сябе праз напісанае класікамі: напрыклад, верш Максіма Танка «Родная мова» альбо словы з «Ліста ў рэдакцыю» Купалы з вельмі пранікнёнымі і аптымістычнымі думкамі пра Беларусь: «Беларусь на сваім доўгім вяку няма́ла чаго перажыла. Не раз і не два была арэнай крывавых змаганняў Захаду і Усходу за панаванне над падняволенымі народамі. Паншчыну перанесла на сваіх працавітых плячах. Але Беларусь яшчэ і іншую адыгрывала ў гісторыі ролю: праз яе абшары і народ ішлі калісьці, у той час вялікія і агульналюдскія, ідэалы навукі і ведаў...»

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Вершасклон

# ДУША ПРОСІЦЬ...

**Сказаць пра тое, чым жывеш. Сказаць пра тое, што баліць. Сказаць пра тое, што дае радасць. Звычайныя пачуцці ў звычайным жыцці, а як часта бывае, што цяжка знайсці словы, каб сказаць пра іх. Каб жывое жыццё было ў гэтых словах. Каб укласці ў іх увесь свой боль. Ці каб яны сапраўды поўніліся радасцю. Вось у самыя насычаныя эмоцыямі моманты неяк самі сабою прыходзяць словы, народжаныя роднай мовай. Можа, таму, што душа менавіта іх просіць. А мы часам проста не звяртаем на гэта ўвагі і гаворым, як атрымліваецца...**

Наша чытачка з Глыбокага Марына Бука якраз-такі звяртае. Па покліч душы яна стала пісаць вершы па-беларуску. Ужо друкавалася ў «Вясёлцы» і «Родным краі», а вось цяпер узяла і вырашыла падзяліцца вершаванымі думкамі з чытачамі «Звязды», сярод якіх менавіта тыя людзі, якія жывяцца словам, якое сэрцу міла...

Вельмі прыемна, што сярод чытачоў нашай газеты ёсць маладыя людзі, якім неабыякавая будучыня роднай мовы, а значыць, і беларускай культуры. Марына Бука пра сябе напісала:

«Мне 24 гады, 10 з якіх я пішу вершы, казкі, апавяданні. Зараз з сям'ёй жывём у Глыбокім, дачушцы ўжо год і 8 месяцаў. Яна крыху дазваляе займацца любай сэрцу справай. Вершы складаюцца проста, пра тое, што блізкае сэрцу, аб чым баліць душа. Гэта родны край, мова, каханне.

Мае бацькі жывуць у вёсцы Луцк-Мосарскі, мясцовасць у нас чароўная: побач лес, два возеры, прыгожыя палеткі, дзе сеюць жыта і іншыя культуры, рамонкавыя палі, бярэзнік, вялізны штучны вадаём, дзе бяруцца спрытныя карасі... Шмат крынічак, а якая ў іх вадзіца, піў бы і піў — і не напіцца. Хачу з вамі падзяліцца сваім шчасцем, што жыву побач з такімі мясцінамі, сказаць дзякуй маці і яшчэ настаўніцы літаратуры Вышадка Алене Усцінаўне за тое, што адкрылі мне хараство нашай мовы».

Сёння мы друкуем некалькі яе вершаў.

### РОДНАЙ МОВЕ

*Дакрануцца, абняць, прыхінуцца*
*На хвілінку, на момант адзін,*
*Проста побач з табой апынуцца,*
*Каб забыцца пра цікат гадзін.*
*Прыпыніцца, дыхання схапіўшы,*
*Дакрануцца дрыготкай рукой*
*І заціхнуць, пра ўсё пазабыўшы,*
*У абдымках адзінай маёй.*
*На каленях я буду маліцца,*
*Каб жыла і жыла з веку ў век.*
*Каб жывою тваёю вадзіцай*
*Смагу мог спаталіць чалавек.*

***

*Замаўчала наша вёска,*
*Больш не кліча, не пяе,*
*Ціха шэпча мне бярозка*
*Аб гарачым аб жніве.*
*Праляціць машына гулка,*
*І заціхне ўсё ўраз,*
*Нават вецер рэчы-клункі*
*Пазбіраў, сышоў ад нас.*
*Помню, марыла калісьці,*
*Што збудуюць шмат дамоў,*
*Але не знайшлося выйсце,*
*З гарадоў вярнуць сыноў.*
*Сціхла вёска, анямела*
*Ўсё ж без вашых галасоў,*
*Пазірае ўслед нясмела,*
*І не прамаўляе слоў...*

**Марына БУКА.**

Прэм'ера рубрыкі:
Моўныя актуаліі

# СЛОВА ЯК СВЯТА

**ЗІМА паставіла моўныя пытанні... І бадай кожны год яны ўзнікаюць: як правільна называць па-беларуску нашы любімыя святы, якія адзначаюцца на пачатку года? І кожны год гэтыя пытанні павісаюць у паветры: бо калі чытачы пачынаюць тэлефанаваць, пісаць лісты, адразу не адкажаш, а потым ужо і вясна прыходзіць са сваімі святамі. Але сёлета мы ўсё-такі вырашылі хоць і напрыканцы зімы даць адказы на пытанні, якія вельмі цікавяць нашых чытачоў, такім чынам маем магчымасць даць прыгожы, цёплы моўны напамін пра хрысціянскія святы, якія ўжо мінулі. Але тым самым маем магчымасць перакінуць масток да тых галоўных святаў, якія павінна прынесці вясна. Зіма канчаецца: давайце ўзгадаем, што ў ёй было добрага, і як пра гэта правільна сказаць.**
**У гэтым нам дапамагаюць спецыялісты-мовазнаўцы. Наша рубрыка, накіраваная на ўдасканаленне беларускай мовы, рыхтуецца ў супрацоўніцтве з Інстытутам мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Такім чынам, у нас сёння прэм'ера рубрыкі, іншымі словамі: НАРАДЖЭННЕ... З якога ўсё пачынаецца: чалавек, з'ява, нават год...**

ДЛЯ абазначэння галоўнага хрысціянскага свята, якое адзначаецца каталікамі 25 снежня, праваслаўнымі — 7 студзеня, у сучаснай беларускай мове выкарыстанне розных па паходжанні аднаслоўных і двухслоўных назваў *Раджджаство, Ражаство, Ражство, Раство, Божае Нараджэнне, Каляды, Нараджэнне Хрыстова*. Прыведзеныя намінацыі адрозніваюцца сферай выкарыстання (свецкая і рэлігійная), функцыянаваннем у літаратурнай і / або дыялектнай разнавіднасцях сучаснай беларускай мовы, а таксама ступенню прадстаўленасці ў беларускіх лексікаграфічных даведніках.

Як канфесіянальна маркіраваныя можна ахарактарызаваць у першую чаргу назвы *Раджджаство і Божае Нараджэнне*. У праваслаўным веравызнанні, важнай крыніцай фарміравання тэрміналогіі якога з'яўляецца царкоўнаславянская мова, агульнапрынятым з'яўляецца найменне *Раджджаство*, якое ўзыходзіць да праславянскага дзеяслова **roditi*. Паводле перакладнога «Слоўніка рэлігійных і багаслоўскіх тэрмінаў царкоўнаславянска-беларускага», гэта намінацыя прапанавана толькі ў дачыненні да з'яўлення на свет Ісуса Хрыста: *Рождество Христово — Раджджаство Хрыстова* (гл. сайт www.churchby.info). У адносінах да іншых асоб у якасці адпаведніка да *рождество* падаецца *нараджэнне*: *Рождество Иоанна Предтечи — Нараджэнне Іаана Прадцечы, Рождество Пресвятой Богородицы — Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы* (там жа). Прыметнік *рождественский* перакладаецца як *раджджэственскі, калядны*.

Сярод каталіцкіх вернікаў актыўна функцыянуе двухслоўная назва з кампанентамі праславянскага паходжання *Божае Нараджэнне* (параўн. польск. *Boze Narodzenie*).

У беларускамоўных тэкстах таксама шырока прадстаўлены адаптаваныя да беларускай мовы найменні *Раство, Ражаство, Ражство,* прычым ва ўжыванні пераважае *Раство* (гл. сайт www.google.by). Гэтая ж назва падаецца як асноўная ў энцыклапедыі «Беларускі фальклор» (2006): *Раство (Ражаство, Нараджэнне Хрыстова, Раство Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста) (с. 434);* яна таксама згадваецца ў энцыклапедыі «Рэлігія і царква на Беларусі» (2001).

З прыведзеных вышэй лексем і іх спалучэнняў у нарматыўных слоўніках сучаснай беларускай літаратурнай мовы зафіксавана толькі лексема *Каляды* / *Коляды*. Гл., напр., «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» [*Каляды, -ляд*; адз. няма. Царкоўнае хрысціянскае свята нараджэння Хрыста, якое адзначалася 25 снежня па ст. ст. і ў наступныя дні да Вадохрышча] (т. 2, 1978, с. 595), а таксама «Беларускі арфаграфічны слоўнік» (2009, с. 286), «Русско-белорусский словарь» (т. 2, 2002, с. 260), «Беларуска-рускі слоўнік» (т. 2, 2003, с. 117). Аднак пры ўжыванні гэтага слова ў названым значэнні важна мець на ўвазе, што *першапачаткова Калядамі* называлася народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання, звязанага з першым павелічэннем самага кароткага дня. Толькі з цягам часу з усталяваннем хрысціянства назва *была прымеркавана* да свята нараджэння Хрыста і Вадохрышча. Трэба мець на ўвазе і тое, што беларусамі ў залежнасці ад іх веравызнання Каляды святкуюцца на працягу двух тыдняў (у каталікоў з 24 снежня па 6 студзеня, у праваслаўных — з 6 па 21 студзеня), а свята з'яўлення на свет Ісуса Хрыста адзначаецца адзін дзень — адпаведна 25 снежня і 7 студзеня. Таму ў папулярным сёння выразе *Віншуем з Калядамі!* намінацыя *Каляды* падаецца абагуленай, паколькі абазначае розныя па паходжанні святы, якія маюць свае адметнасці.

У свецкай сферы для абазначэння галоўнага хрысціянскага свята найбольш прымальным можа лічыцца найменне *Нараджэнне Хрыстова,* у складзе якога назоўнік *нараджэнне* (ён, як і *раджджаство*, узыходзіць да праславянскага дзеяслова **roditi*) адпавядае фанетычным і словаўтваральным асаблівасцям беларускай мовы і дакладна перадае сэнс падзеі, якая называецца: *нараджэнне* «з'яўленне на свет; дзень, дата, калі хто-н. нарадзіўся, а таксама святкаванне гэтага дня» («Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», т. 3, 1979, с. 297). Пры гэтым форма ўласнага імя *Хрыстова* сёння актыўна ўжываецца ў асяроддзі як праваслаўных, так і каталікоў. Гэтае спалучэнне можа быць уключана ў нарматыўныя слоўнікі беларускай літаратурнай мовы як адпаведнік руск. *Рождество Христово.* Іншыя разгледжаныя тут назвы таксама мэтазгодна прадставіць у беларускамоўных лексікаграфічных даведніках, зрабіўшы паметы, якія паказваюць сферу іх выкарыстання і функцыянавання.

**Наталля ПАЛЯШЧУК, загадчык аддзела гісторыі беларускай мовы Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук.**

# МАКСІМУМ БЕЛАРУСКАСЦІ

**Не ўсе радыёстанцыі, якія вяшчаюць у Беларусі, маюць беларускамоўныя эфіры альбо хаця б некалькі перадач на роднай мове. Радыё «Беларусь» вяшчае для замежжа. Робіць гэта на сямі мовах. У тым ліку — па-беларуску. Акрамя таго, радыё «Беларусь» нават мае адмысловыя эфіры з урокамі беларускай мовы для замежных небеларускамоўных слухачоў. І 100% беларускай музыкі. Здаецца, тут максімум беларускасці.**



Маладыя супрацоўнікі радыё Алёна Шыкун і Яўген Калечыц у студыі.

Прадстаўляць нашу краіну за мяжой — вельмі важны і адказны занятак. Замежныя слухачы радыё «Беларусь» успрымаюць яе скрозь прызму перадач і эфіраў гэтай радыёстанцыі. Што адбылося ў нашай краіне сёння? Што цікава ў беларускім шоу-бізнэсе і мастацтве? 16 гадзін вяшчання на беларускай, рускай, польскай, нямецкай, англійскай, французскай і іспанскай мовах, 10 гадзін інтэрнэт-вяшчання штодня ў рэжыме рэальнага часу на англійскай мове, 182 праекты — усё гэта радыё «Беларусь». Яно прадстаўляе нашу краіну тым, хто жыве за яе межамі. Слухачы розныя: ад прадстаўнікоў беларускай дыяспары да жыхароў самых экзатычных краін.

— Зараз мы праводзім конкурс «Адкрый для сябе Беларусь», дзе задаём слухачам пытанні, звязаныя з гісторыяй і культурай нашай краіны, — распавядае **Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, дырэктар радыё «Беларусь»**. — Конкурс паказвае, што нас слухаюць у такіх «нечаканых» краінах, як Трынідад і Табага, Індыя, Бангладэш, Нігерыя і інш. Акрамя таго, у нас вельмі шмат слухачоў у розных іншых кутках свету. У Швецыі ў нас ёсць ужо нават сябры. Адзін з іх — Ульмар Квік — піша нам кожны дзень! Робіць заўвагі, прапановы, піша, што яму спадабалася, а што не вельмі. А Тэры Джонс з Лондана прыязджае да нас кожны год. І не толькі дапамагае нашаму радыё ўдасканальваць англійскую мову. Ён ездзіў з намі на экскурсію ў Полацк. Мы маем вельмі шмат сяброў за мяжой, якія сталі сябрамі нашай краіны. І нас шмат хто слухае. Калі ўлічыць, што толькі ў Нямеччыне «Радыё 700», якое рэтранслюе штодня 2 гадзіны нашага эфіру, мае паўтара мільёна кабельных абанентаў, а наведвальнасць іх сайта — 10 тысяч чалавек на дзень, то стане зразумела, што нас слухае вельмі шмат людзей па ўсім свеце.

Нягледзячы на тое, што каля 75% эфіру радыё «Беларусь» складаюць праграмы на тэмы палітыкі, эканомікі і сацыяльнага жыцця, беларуская культура і мова займаюць вельмі значнае месца ў сетцы вяшчання.

— Вядома, сацыяльна-палітычнае жыццё — гэта тое, дзеля чаго мы працуем, дзеля чаго ў маі 1962 года і было створана радыё «Беларусь». Каб несці афіцыйную пазіцыю Беларусі па розных пытаннях, — тлумачыць **Зміцер ЗАНЕЎСКІ, загадчык аддзела падрыхтоўкі праграм для эфірнага вяшчання, намеснік дырэктара Дырэкцыі падрыхтоўкі праграм на замежных мовах.** — Але беларуская культура заўжды выклікае вялікі інтарэс. Таму ў нас шмат цікавых перадач і праектаў на розных мовах, прысвечаных культуры. Прычым толькі невялікая частка нашых перадач на замежных мовах перакладныя. Большая частка — арыгінальныя перадачы для кожнай з моў: «Культурная палітра Беларусі», «Цывілізацыя: навука, мастацтва, адукацыя», «Знакамітыя людзі Беларусі», «Хочаце верце — хочаце не» (аўтарская перадача Арсеня Якавенкі, у якой замежныя слухачы знаёмяцца з беларускімі казкамі ў перакладзе на англійскую мову). Шмат у нас адмысловых перадач пра музычную культуру Беларусі: «Музычная галерэя» (вядучы — Раман Яніў), «Музычная крама» на англійскай мове, «У іншым фармаце»... Прычым у нашай ратацыі вы можаце пачуць самую розную беларускую музыку: ад класікі да экстрэмальнай альтэрнатывы. Гурты «Троіца» Івана Кірчука і «Сярэбранае вяселле» Святланы Бень нашы частыя госці. Ёсць у нас і перадача Рамана Яніва «Кіно ў Беларусі», у якой ён распавядае пра асаблівасці айчыннага кінапракату, поспехі і няўдачы беларускага кінематографа.

Але, напэўна, самым экстраардынарным і асветніцкім праектам радыё «Беларусь» з'яўляюцца ўрокі беларускай мовы. Пакуль яны даступныя на трох замежных мовах: англійскай, нямецкай, польскай. Першай іх вядучай была паэтка Таццяна Сівец, якая прыйшла на радыё «Беларусь», яшчэ вучачыся ў магістратуры БДПУ імя Максіма Танка. Сёння на сайце радыё **http://www.radiobelarus.tvr.by** вы можаце спампаваць бадай усе гэтыя ўрокі і спасцігаць адну з самых мілагучных моў у свеце самастойна.

«Беларуская мова займае значнае месца ў беларускім грамадстве, з'яўляючыся сімвалам нашай адметнасці. Беларуская мова жыве ў афіцыйных паперах і вулічных шыльдах. Яе выкладаюць у школах, і кожны беларус валодае ёй. Без ведання беларускай мовы не абысціся, калі вы бываеце ў Беларусі або цікавіцеся беларускай літаратурай і культурай. Нашыя ўрокі не будуць абмяжоўвацца толькі вывучэннем лексіка-граматычнага матэрыялу. Разам з гэтым, вы атрымаеце магчымасць пазнаёміцца з беларускімі традыцыямі і абрадамі, пачуць урыўкі з выдатных твораў беларускай літаратуры і многае іншае.... На жаль, нягледзячы на шматлікія намаганні беларускай інтэлігенцыі, часам знаходзяцца людзі, якія лічаць беларускую мову прыкметай вясковасці, але большасць беларусаў імкнецца захаваць сваю родную мову!» — чытаем на інтэрнэт-старонцы радыё «Беларусь». Магчыма, гэта крыху перабольшаныя словы... Але, відаць, яны з'явіліся ад вялікага ідэалістычнага і патрыятычнага жадання супрацоўнікаў радыё «Беларусь», каб так і было насамрэч.

— Мы надаём вельмі вялікую ўвагу беларускаму аспекту, — запэўнівае Навум Гальпяровіч. — Акрамя ўсяго, робім перадачы пра нашых літаратараў: «Магія слова», «Скарбы роднай літаратуры», «Скарбы роднай мовы». Сярод нашых аўтараў — вядомы паэт Алесь Бадак, пісьменнік Уладзімір Ліпскі, журналіст Вадзім Гігін, кандыдат філалагічных навук Таццяна Старасценка і інш. Папулярызацыя нашай мовы і нацыянальнай спадчыны ў нас на першым месцы. І гэта сапраўды тое, чаго чакаюць ад нас нашы слухачы. Частыя госці ў нас вучоныя, краязнаўцы, спецыялісты ў галіне народнай творчасці.

Дарэчы, слухаць радыё «Беларусь» можна не толькі за мяжой. Усе цікаўныя беларусы могуць рабіць гэта на сваёй радзіме. Самы лёгкі спосаб — інтэрнэт. А ў памежных з Літвой і Польшчай раёнах радыё «Беларусь» можна слухаць нават у FM-фармаце.



Калектыў радыё «Беларусь». У першым радзе другі справа — дырэктар радыё Навум Гальпяровіч.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

# Ці загавораць кітайцы на мове Коласа?

**Для сучаснага чалавека валоданне замежнай мовай — абавязковы «пункцік» яго жыццёвых планаў. Гэта і прафесійны складнік, і проста карыснае захапленне. Сёння вывучыць тую ці іншую мову зусім няцяжка: шматлікія школы і інстытуты прапаноўваюць безліч курсаў і праграм. Англійская ці нямецкая, французская ці італьянская, кітайская ці японская, інданезійская ці кечуа — выбар, як той казаў, на любы густ. А ці задумваўся хто з беларусаў, што для кагосьці наша родная мова з'яўляецца вельмі цяжкай і складанай, нават экзатычнай? Што дзеля таго, каб авалодаць ёю, хтосьці прыкладае шмат сіл і намаганняў? «Хто гэта можа быць?» — спытаеце вы. Дык хоць кітайскія студэнты, якія прыехалі ў Беларусь атрымаць вышэйшую адукацыю!**

Юлія Назаранка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Інстытута журналістыкі БДУ, ужо два гады выкладае студэнтам-кітайцам беларускую мову. Справа гэтая як для выкладчыка, так і для студэнтаў-замежнікаў зусім няпростая. Тым не менш, даволі цікавая і плённая. Беларуская і кітайская — дзве розныя, непадобныя адна да адной мовы. Таму навучыць кітайцаў размаўляць па-беларуску — быццам навучыць іх увогуле нанова гаварыць.

— Найперш студэнты знаёмяцца з фанетычным ладам беларускай мовы, прынамсі ў параўнанні з рускай, якой яны больш-менш валодаюць пасля падрыхтоўчага факультэта, — расказвае Юлія Назаранка. — Усе фанетычныя асаблівасці, а менавіта цвёрдае вымаўленне *ж, ш, ч, р,* фрыкатыўнае *г* мы разам засвойваем, калі ўзнікаюць памылкі, тут жа іх выпраўляем. Складана, але студэнты шмат пішуць, чытаюць, увесь час паўтараюць. Калі штосьці незразумела па-беларуску, у якасці пасрэдніка карыстаемся рускай мовай.

Заняткі праходзяць у групах па 10-15 чалавек, таму кожнаму хапае ўвагі. Але варта адзначыць, што ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў даволі розны. Некаторыя кітайцы лёгка чытаюць і ўспрымаюць беларускую мову, а для кагосьці формулы вітання — мяжа магчымасцяў. Затое кемлівасці ў іх хапае з лішкам. Калі спытаць у кітайца, якія беларускія словы ведае, ён хуценька дастане праязныя білеты і пачне пералічваць: студзень, люты, сакавік, красавік і г.д.

Каб удасканальваць свае маўленчыя ўменні, многія студэнты вучаць вершы на памяць. Гэта і дзіцячыя чатырохрадкоўі, і сур'ёзныя творы класікаў. Дарэчы, у снежні ў Інстытуце журналістыкі праходзілі чытанні ў гонар 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Сярод іх удзельнікаў былі і студэнты-замежнікі. Плануецца, што да 130-й гадавіны Якуба Коласа яны зноў прадэкламуюць вершы беларускага класіка.

— Я трошкі ведаю беларускую мову. Яна вельмі прыгожая, — адзначае былы студэнт Інстытута журналістыкі БДУ Пэй Ван. — Нават чытаў некаторыя творы пісьменнікаў Беларусі. Гэта сапраўды вельмі цяжка. Паэзію лягчэй зразумець.

— Я ведаю толькі некалькі беларускіх слоў, — кажа студэнт гуманітарнага факультэта БДУ Ксяо Чэн. — Мне падабаецца беларуская мова, але дасканала авалодаць ёй вельмі цяжка. Бо амаль усе навокал размаўляюць па-руску, з беларускай мовай я сутыкаюся толькі на занятках. Гэтага вельмі мала.

— Прабачце, але я амаль не размаўляю па-беларуску. Зараз я вывучаю толькі рускую мову. Адчуваю, што беларуская мова падобна да рускай: пра штосьці нават магу здагадацца, — распавядае магістрантка філфака БДУ Цзын Ван. — Беларуская мова — нацыянальная мова Беларусі, сімвал яе незалежнасці. Але чамусьці беларусы рэдка на ёй гавораць. Чаму?.. Вось я, напрыклад, з задавальненнем вывучыла б беларускую, хоць мне яна падаецца вельмі экзатычнай.

Той фактар, што студэнты-кітайцы не знаходзяцца ў беларускамоўным асяродку, замінае іх больш лёгкаму навучанню. Так лічыць і Юлія Назаранка. Але як цяжка б ім не прыходзілася, многія замежныя студэнты маюць вялікае жаданне спасцігнуць, адчуць прыгажосць беларускай мовы. Прыкра, што такога жадання не назіраецца сярод многіх беларусаў. Шкада, што родная мова для нас становіцца экзотыкай...

**Любоў КАСПЯРОВІЧ.**

# алімпіец

ЗВЯЗДА

ВЫПУСК № 2 (14)

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь


> У КОЖНАГА ФРЫСТАЙЛІСТА СВОЙ АБСАЛЮТНА ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ГРАФІК, ЯКІ МОЖА НЕ ЎКЛЮЧАЦЬ ТОЕ ЦІ ІНШАЕ СПАБОРНІЦТВА. ТАМУ НАРМАЛЬНА, ШТО Ў МІНСК ПРЫЕДУЦЬ НЕ ЎСЕ ФАВАРЫТЫ. АЛЕ БУДУЦЬ МОЦНЫЯ АМЕРЫКАНЦЫ, КАНАДЦЫ І КІТАЙЦЫ. СЛОВАМ, ЁСЦЬ З КІМ ЗМАГАЦЦА

> ПЕРАД ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫКАЙ СТАІЦЬ НЯПРОСТАЯ ЗАДАЧА ЗАВАЯВАННЯ 5-7 АЛІМПІЙСКІХ МЕДАЛЁЎ. УСЯГО ДЗВЕ КАМАНДЫ Ў СВЕЦЕ ЗАЯЎЛЯЮЦЬ ПРА БОЛЬШЫЯ МЕДАЛЬНЫЯ СПАДЗЯВАННІ — РАСІЯ І ЗША. НА 6-7 МЕДАЛЁЎ У ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ РАЗЛІЧВАЕ ГАСПАДЫНЯ АЛІМПІЯДЫ ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. У АСТАТНІХ ДАМАГАННІ БОЛЬШ СЦІПЛЫЯ: ІСПАНІЯ, ГЕРМАНІЯ, ІТАЛІЯ І ФРАНЦЫЯ ЗАДАВОЛЯЦЦА 4-5 МЕДАЛЯМІ

**Да Алімпійскіх гульняў у Лондане засталося 157 дзён. Беларускія спартсмены ўступілі ў завяршальны этап падрыхтоўкі**

ПАДЗЕЯ

## РАЎБІЧЫ ЗНОЎ ЗБІРАЮЦЬ ЛЕПШЫХ ФРЫСТАЙЛІСТАЎ

25 лютага ў Раўбічах адбудзецца 8-ы этап Кубка свету па фрыстайле. Упершыню наша краіна прымала лепшых фрыстайлістаў планеты летась. Тады адразу два беларусы падняліся на подыум — Антон Кушнір і Дзяніс Восіпаў. Сёлета ў іх будзе шанц паўтарыць сваё перамогі на «родным» схіле. Таксама ў Раўбічах выступяць Максім Гусцік, які напярэдадні заняў другое месца на этапе Кубка свету ў Аўстрыі, Дзмітрый Дашчынскі і Ганна Гуськова. Па словах галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай па фрыстайле Мікалая Казекі, магчыма, да спаборніцтваў прыцягнуць яшчэ некаторых лыжных акрабатаў, якія добра праявілі сябе на этапе Кубка Еўропы, што скончыўся ў Раўбічах на выхадных.



Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

«У гэтым сезоне няма ніякіх важных стартаў накшталт чэмпіянату свету, і да Алімпіяды яшчэ два гады. Таму на этапах Кубка свету выступаюць толькі тыя спартсмены, якія імкнуцца заняць высокае месца у генеральнай класіфікацыі, — расказвае Мікалай Казека. — У кожнага фрыстайліста свой абсалютна індывідуальны графік, які можа не ўключаць тое ці іншае спаборніцтва. Таму нармальна, што ў Мінск прыедуць не ўсе фаварыты. Але будуць моцныя амерыканцы, канадцы і кітайцы. Словам, ёсць з кім змагацца».

У Мінск прыедзе амаль 60 спартсменаў з розных краін свету. Акрамя амерыканскіх, канадскіх і кітайскіх атлетаў, супрацьстаяць беларусам будуць лыжныя акрабаты са Швейцарыі, Казахстана, Украіны, Расіі.

Яшчэ летась спецыялісты адзначалі добрую арганізацыю турніру. Якасць раўбіцкага схілу атрымала толькі станоўчыя водгукі. У пачатку лютага ўзніклі пэўныя праблемы з трамплінамі. Але, па словах намесніка дырэктара спарткомплексу «Раўбічы», усё ўжо выправілі, і схіл поўнасцю гатовы, каб прыняць лепшых фрыстайлістаў планеты. Спадзяёмся, і ў гэты раз сярод прызёраў будуць беларускія спартсмены.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

Калегія Мінспорту

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — СПАРТСМЕНАМ ЭКСТРАКЛАСА

**Міністр спорту і турызму заклікаў ні ў чым не адмаўляць перад Лонданам-2012 Карстэн, Азаранцы і Шараковай**

**На мінулым тыдні кіраўніцтва Міністэрства спорту і турызму абмеркавала вынікі працы галіны ў 2011 годзе і вызначыла планы на год 2012-ты, у якім, як вядома, пройдзе Алімпіяда ў Лондане.**



Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

Міністр спорту і турызму Алег Качан нагадаў, што асноўная задача на 2012 год пастаўлена кіраўніком дзяржавы — гэта заваяванне 25 алімпійскіх медалёў (сярод іх — 5 залатых).

— На гэты момант мы маем 105 алімпійскіх ліцэнзій у 19 відах спорту. За такі ж тэрмін да Алімпіяды ў Пекіне ў нас было 96 пуцёвак у 13 відах. Тым часам выступленне нашай каманды ў Пекіне стала адным з самых паспяховых — беларускія спартсмены заваявалі 19 медалёў, — нагадаў Алег Качан.

Ён адзначыў, што ў 2011-м беларускія атлеты заваявалі ў алімпійскіх дысцыплінах на чэмпіянатах свету і Еўропы 15 медалёў (а гэта на 2 больш, чым за год да пекінскай Алімпіяды). Такі вынік дазволіў нашай краіне захаваць месца ў 20-ы наймацнейшых краін у сусветным рэйтынгу. Беларусь займае 16-е месца, і канкурэнцыю ёй складаюць Украіна (18 медалёў), Новая Зеландыя (16), Канада (15), Венгрыя (13). У той жа час з 15 заваяваных беларусамі медалёў усяго чатыры — залатыя (за год да Гульняў у Пекіне іх было 6).

Алег Качан нагадаў, што на заключным этапе падрыхтоўкі да Лондана трэба асаблівую ўвагу надаць спартсменам экстракласа. І назваў імёны двухразовай алімпійскай чэмпіёнкі па акадэмічным веславанні Кацярыны Карстэн, рэкардсменкі і чэмпіёнкі свету па веласпорце Таццяны Шараковай, першай ракеткі свету тэнісісткі Вікторыі Азаранкі. Таксама міністр папрасіў звярнуць увагу і на маладых спартсменаў, якія вызначыліся ў 2011-м. Гэта экіпаж жаночай байдаркі-чацвёркі, які сенсацыйна стаў чэмпіёнам Еўропы і бронзавым прызёрам чэмпіянату свету. Тым больш што вопыт такой працы ў нас ёсць — гэта падрыхтоўка алімпійскіх чэмпіёнаў братоў Багдановічаў у байдарцы-двойцы.

Тым часам міністр звярнуў увагу на неперараканаўчыя лічбы адбору ў лёгкай атлетыцы, кулявой стральбе і акадэмічным веславанні. А вынікі адбору на Алімпіяду ў спартыўнай гімнастыцы і скачках у ваду назваў надзвычай нездавальняльнымі. Міністр нагадаў, што не прайшлі на Алімпіяду зборныя па баскетболе і гандболе, шанцы на ўдзел мінімальныя ў водным пола, пакуль у лісце чакання таэквандзістка Вікторыя Беланоўская. Алег Качан паведаміў, што яшчэ мяркуецца заваяванне ліцэнзій у бадмінтоне (1), конным спорце (3), тэнісе (6), дзюдо (7), сінхронным плаванні (10), скачках у ваду (2), фехтаванні (4) і каманды па хакеі на траве. Дадаткова стаіць задача па заваяванні ліцэнзій перад лёгкай атлетыкай (20), акадэмічным веславаннем (9), боксам (5), кулявой стральбой (4) і сучасным пяцібор'ем (3). Гэта дазволіць удзельнічаць у Гульнях у аптымальным складзе — каманда будзе налічваць 180 спартсменаў.

Міністр падкрэсліў, што ў 2011-м працягвалася будаўніцтва спартыўнай інфраструктуры. Лядовыя палацы адкрыліся ў Лунінцы, Івацэвічах, лядовыя арэны пачалі працаваць у Беразіно, Барысаве, Любані, Маладзечне, цэнтр бокса з'явіўся ў Віцебску, у Полацку ўведзена першая чарга вяслярнага канала, плавальны басейн адкрыўся ў Расонах, спартыўна-аздараўленчы комплекс «Алімпія» — у Лідзе. У сувязі з гэтым чакаецца павышэнне да 18% колькасці насельніцтва, якое рэгулярна займаецца фізкультурай і спортам (у 2011-м гэта лічба складала 16,6%).

Міністр зазначыў, што ўсяго 6 спартыўных арганізацый дасягнулі летась самаакупнасці. Гэта прадпрыемства «Аква-Мінск», Мінскі палац спорту, УП «Аквацэпт» (Гродна), Віцебскі палац спорту, стадыёны «Будаўнік» (Брэст) і «Дынама» (Мінск). У большасці ж арганізацый даходы складаюць каля 50-80% ад расходаў. Спартыўныя школы не могуць пакуль дасягнуць самаакупнасці. У Беларусі ў іх займаецца каля 190 тысяч школьнікаў (каля 20%). Гэты рэсурс, на думку міністра, дазваляе падрыхтаваць якасны алімпійскі рэзерв.

Анатоль БАДУЕЎ:

### «Толькі Расія і ЗША маюць большыя медальныя спадзяванні»

Лёгкая атлетыка — адзін з відаў, дзе колькасць заваяваных ліцэнзій пакуль не задавальняе спартыўнае кіраўніцтва. Тым часам ад «каралевы спорту» чакаюць значных унёскаў у медальны план. Галоўны трэнер нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы Анатоль Бадуеў расказаў, ці рэальна выканаць медальную задачу.

— Зараз лёгкаатлеты маюць 23 ліцэнзіі групы А. Жаночая эстафетная каманда, якая трапляе на Гульні ў залежнасці ад рэйтынгу, знаходзіцца на шостай, прахадной, пазіцыі, і, мяркую, на ёй і застанецца. На аналагічны перыяд перад Пекінам у нас было 27 ліцэнзій, на трапленне ў васьмёрку наймацнейшых прэтэндавала 15 атлетаў. Зараз гэта па сілах 18 спартсменам, — акрэсліў сітуацыю Анатоль Бадуеў.

Перад лёгкай атлетыкай стаіць няпростая задача заваявання 5-7 алімпійскіх медалёў. Усяго дзве каманды ў свеце заяўляюць пра большыя медальныя спадзяванні — Расія і ЗША. На 6-7 медалёў у лёгкай атлетыцы разлічвае гаспадыня Алімпіяды Вялікабрытанія. У астатніх дамаганні больш сціплыя: Іспанія, Германія, Італія і Францыя задаволяцца 4-5 медалямі, нашы суседзі Польшча і Украіна — двума-трыма.

Найбольшыя медальныя спадзяванні выклікаюць у нас, як вядома, штурхальніцкія дысцыпліны. У кіданні молату Анатоль Бадуеў называе прозвішчы Ціхана і Дзевятоўскага, да якіх дадаліся Шаюноў, Крывіцкі і Святоха. У жанчын у гэтай дысцыпліне пачала падрыхтоўку пасля нараджэння дзіцяці алімпійская чэмпіёнка Аксана Мянькова. У штурханні ядра таксама нашы пазіцыі моцныя дзякуючы Надзеі Астапчук, Наталлі Міхневіч і Яніне Правалінскай-Карольчык. У шматбор'і спадзяваецца сёлета можна не толькі на Андрэя Краўчанку, але і на Эдуарда Міхана.

Нядрэнныя шанцы маюць прадстаўніцы «слабай паловы» у скачках у даўжыню і бегу на 800 метраў. Застаецца дадаць, што кожную Алімпіяду жанчыны прыпадносілі нам прыемныя сюрпрызы, сярод якіх перамогі Юліі Несцярэнкі ў Афінах і Аксаны Мяньковай у Пекіне. Будзем спадзявацца на іх і на гэты раз.

Ігар ЗАІЧКОЎ:

### «Наш лепшы лыжнік застаўся без зарплаты, яшчэ адзін — увогуле не атэставаны»

Шэраг крытычных заўваг па падрыхтоўцы да Лондана-2012 выказаў памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізкультуры і спорту Ігар Заічкоў.

«6 нацыянальных камандаў выканалі нарматыўныя патрабаванні па колькасці ліцэнзій, 13 — не выканалі. Ім паказалі на гэта. Але хто будзе выконваць? Мы з вамі доўга мучымся. Калі людзі не выканалі да гэтага задачу, то і не выканаюць. А да Алімпіяды засталося 160 дзён», — нагадаў памочнік Прэзідэнта.

Ігар Заічкоў незадаволены рэалізацыяй рашэнняў і дысцыплінай:

Некаторыя нацыянальныя каманды падаюць на акрэдытацыю ў Лондан нейкія нерэальныя спісы спартсменаў: акадэмічнае веславанне — 40 чалавек, спартыўная гімнастыка — 6 чалавек... Калі міністэрства не ў стане адрэгуляваць гэта, няхай возьмецца НАК.

Маюць месца ў апошні час і «праколы» з заработнай платай і атэстацыяй спартсменаў:

Не ведаю, як міністэрства будуе сваю працу такім чынам, што Сяргей Давідовіч, наш лепшы лыжнік, застаўся без зарплаты! Яшчэ адзін лыжнік, Аляксей Іваноў, які зараз вельмі паспяхова выступае за замежную каманду, увогуле не атэставаны. Так і атрымліваецца, што на чэмпіянаце Беларусі выступае 20 чалавек з 3000 спартсменаў, якія займаюцца лыжнымі гонкамі.

Напрыканцы памочнік Прэзідэнта звярнуў увагу на пытанні набыцця інвентару і экіпіроўкі:

Багдановіч у прэсе кажа, што для выступлення яму даюць рэкламную лодку за 8 тысяч еўра. А міністэрства ўсё для некага лодкі набывае. Магчыма, трэба правесці рэвізію апошніх набыткаў? Дагэтуль няма экіпіроўкі... Хачу нагадаць, што калі пералічанае не будзе зроблена зараз, гэтым будуць займацца іншыя.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

АЛІМПІЙСКІ ДАЙДЖЭСТ

## ЗНАЙСЦІ СПОНСАРА — НЕ ПРАБЛЕМА...

Алімпійскія гульні рызыкуюць застацца без галоўнага спонсара — нафтагазавай кампаніі British Petroleum. Эколагі і грамадскія дзеячы не задаволены, што спансіраваць галоўнае спартыўнае спаборніцтва планеты збіраецца кампанія, чыя дзейнасць «вядзе да незваротных змен у клімаце». «Грынпіс» Вялікабрытаніі і яшчэ шэраг актывістаў, сярод якіх нават кандыдат у мэры Лондана Джэні Джонс, ужо накіравалі адкрыты ліст у Міжнародны алімпійскі камітэт, дзе гаворыцца аб абсурднасці такой сітуацыі. Аднак фармальна ніякіх парушэнняў няма, і арганізатары Алімпіяды не спяшаюцца адмаўляцца ад фінансавай падтрымкі кампаніі. І гэта зразумела. Яшчэ два месяцы таму ўрад Вялікабрытаніі ў два разы павялічыў бюджэты асноўных артыкулаў расходаў — цырымоніі адкрыцця і закрыцця (з 40 да 81 млн фунтаў), забеспячэнне бяспекі спартсменаў (з 227 да 553 млн фунтаў). Натуральна, страціць буйнога спонсара з такімі выдаткамі азначае сапраўдную фінансавую катастрофу. Пакуль прадстаўнікі British Petroleum спрабуюць супакоіць грамадскасць заявамі аб выкарыстанні ў алімпійскім транспарце біяпаліва, што значна скароціць выкіды вуглякіслага газу ў атмасферу.

Яшчэ раней разгарэўся скандал вакол другога спонсара Алімпіяды — амерыканскай кампаніі Dow Chemicals, чыя дачыная кампанія Union Carbide была звязана з найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофай у гісторыі чалавецтва. У 1984 г. выбух на хімічным заводзе ў індыйскім горадзе Бхапал выклікаў смерць 18 тыс. чалавек. Індыйская алімпійская асацыяцыя патрабавала скасаваць кантракт з амерыканскай фірмай, якая прынесла столькі пакут індыйскаму народу. Аднак інтарэсы Dow Chemicals паспяшаўся абараніць сам Жак Рагэ, спаслаўшыся на багатыя традыцыі амерыканскай кампаніі, якая ўжо на працягу трыццаці гадоў падтрымлівае алімпійскі рух. Гэты канфлікт дагэтуль не вырашаны, і Індыя разглядае варыянт байкоту Алімпійскіх гульняў.



### Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Вікторыю Азаранку з выдатным выступленнем на турніры WTA ў Катары

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў члена нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па тэнісе Вікторыю Азаранка з выдатным выступленнем на турніры WTA ў Катары, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**



Фота БЕЛТА.

«Гэта яркая і пераканаўчая перамога над лепшымі ракеткамі планеты зноў пацвердзіла: твой зорны ўзлёт — не выпадковая ўдача, а вынік вялікай самаадданай работы, жалезнага спартыўнага характару і нястрымнага імкнення быць першай заўсёды і ва ўсім», — гаворыцца ў віншаванні.

«Не сумняваюся, што наперадзе цябе чакаюць вялікія поспехі на самых прэстыжных міжнародных турнірах, дзе мільёны заўзятых тэнісных балельшчыкаў з гордасцю і павагай будуць вымаўляць слова «Беларусь». І ты заўсёды памятай: за табой — Радзіма, дзе ў цябе вераць, любяць і заўсёды чакаюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Вікторыя АЗАРАНКА:

## «Гэта ашаламляльна!»

**Беларуская тэнісістка выйграла трэці ў сезоне турнір**

Выступленне першай ракеткі свету Вікторыі Азаранкі на тэнісным турніры ў Катары можа падацца лёгкай прагулкай: каб справіцца з кожнай суперніцай, ёй хапіла двух сэтаў. Глядзіце самі: Азаранка — Мона Бартэль — 6:1, 6:0; Азаранка — Сімона Халеп — 6:3, 6:1; Азаранка — Яніна Вікмаер — 6:0, 6:4; Азаранка — Агнешка Радваньску — 6:2, 6:4; Азаранка — Саманта Стосур — 6:1, 6:2. Але сухія лічбы не ў стане перадаць драматызму паўфінальнага паядынку. У матчы супраць полькі Радваньску ў другім сэце Віка няўдала пабегла за мячом і падвярнула нагу. Доктар аказаў ёй дапамогу, і тэнісістка здолела вярнуцца на корт, праўда, гэты эпізод мог паставіць крыж на фінальных перспектывах беларускі. Радваньску пачала прымушаць Вікторыю рухацца як мага больш, а ў Азаранкі ад болю на твары выступалі слёзы. Аднак гэты боль, здаецца, толькі дадаў тэнісістцы злосці (як спартыўнай, так і на суперніцу), і перамогу Віка не ўпусціла. Падчас цырымоніі поціску рукі суперніцы абмяняліся кароткім дотыкам: Радваньску, як і Віка, выглядала незадаволенай. Гэта трэці турнір сезона, адкуль полька выбывае дзякуючы беларусцы. А на гэты раз не ўдалося скарыстацца і траўмай Азаранкі.

— Добра, што я не давяла справу да трэцяй партыі, а то не ведаю, чым бы ўсё гэта скончылася, — прызналася Віка пасля матча.

Праўда, траўма аказалася не такой сур'ёзнай: на наступны дзень у фінале наша тэнісістка паказала бліскучы тэніс і за 1 гадзіну 7 хвілін расправілася з аўстралійкай Стосур.

— Гэта ашаламляльна! Я не магу паверыць, што змагла сёння згуляць на такім узроўні. Я ведала, што не буду гатова на 100%, так што мне давялося крыху змяніць тактыку. Аднак, на маё здзіўленне, усе мячы ляцелі ў корт, — падзялілася Азаранка пасля перамогі. — Калі казаць пра маю шчыкалатку, то не ўсё так дрэнна, як магло быць. У мяне ёсць некалькі дзён, каб аднавіцца. Але зараз мне хочацца проста атрымаць асалоду ад моманту і не заглядваць далёка ў будучыню.

Вікторыя атрымала кубак «Залатога арла» і 385 тысяч долараў. А таксама яшчэ больш умацавала сваё першае месца ў рэйтынгу WTA. Цяпер ад другой ракеткі Марыі Шарапавай яе аддзяляе 1580 ачкоў. Адзначым, што ў гэтым сезоне наша тэнісістка выступае бліскуча: яна выйграла ўсе тры турніры і правяла 17 пераможных матчаў запар.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# НОВЫ РЭБУС ДЛЯ ШАЎЦОВА

**Пакуль на вуліцах трывае бязлітасны люты, айчынны гандбол перажывае сапраўдную вясну з верай у пазітыўную будучыню. Крыгаход пайшоў. Дуэт мінскага «Дынама» і брэсцкага БГК імя Мяшкова выдатна выступае ў Еўракубках, а зборная працягвае змагацца за ўдзел у чэмпіянаце свету, які ў наступным годзе прыме Іспанія. Ужо ў мінулым феерычная перамога ў кваліфікацыі над румынамі, у будучыні — два матчы плэй-оф супраць Славакіі. Чаканы квіток на Пірэнеі літаральна ў двух кроках. Трэба толькі перамагчы.**



Да галоўных паядынкаў зборнай застаецца яшчэ тры месяцы. Нехта сапраўды можа адпачнуць, але ў нататніку Юрыя Шаўцова — у мінулым бліскучага гандбаліста, алімпійскага чэмпіёна Сеула, а зараз трэнера гандбольнай зборнай — кожны дзень пазначаны ручкай. Званок карэспандэнта «Звязды» наогул заспеў трэнера ў Гомелі на міжнародным турніры юнацкіх зборных Беларусі, Расіі і Турцыі.

**— Юрый Анатольевіч, вы неяк прызналіся, што дзеля таго, каб на роўных змагацца з камандамі ўзроўню Даніі альбо Расіі нам колькасна пакуль не хапае гульцоў. Ці заўважылі вы на гомельскіх спаборніцтвах перспектыўных гандбалістаў, якія ў будучыні могуць узброіць зборную?**

— Перш-наперш адзначу, што мне наогул спадабаўся гэты турнір. Я назіраў даволі напружаныя матчы. Па настроі, барацьбе і па волі да перамогі мне спадабаліся нашы зборныя 1994 і 1992 гадоў нараджэння. Малодшыя наогул парадавалі — пераканаўча перамаглі старэйшых за іх туркаў. Рэзерв у нас ёсць. Расце вельмі добрае маладое пакаленне гандбалістаў. І ва ўсіх ёсць магчымасць трапіць у галоўную каманду. Толькі калі гэта здарыцца — залежыць ужо ад кожнага гульца.

**— У параўнанні з мінулымі кваліфікацыямі зборная прапускае менш галоў. Задавальвае гульня нашых галкіпераў Казіміра Катлінскага і Віталя Чарапенькі?**

— Так, безумоўна. І гэта дакладна бачна па нашых апошніх выніках.

**— Каманда выканала задачу — прайшла ў плэй-оф, перамагла даволі моцную зборную Румынію. Але ўсё роўна чуюцца заўвагі. Маўляў, каманда доўга ў пошуках сваёй гульні. Ці цалкам задаволены выступленнем каманды?**

— Мне цяжка сказаць, у каго ўзніклі пытанні наконт гульні зборнай. Так, з Люксембургам не склалася, перамаглі ў адзін мяч. Але ў гэтым выпадку казаць трэба пра псіхалогію гандбалістаў, але не пра стыль гульні. У цэнтральным, хатнім матчы з Румыніяй у нас усё атрымалася, згулялі ўдала, выканалі план і перамаглі. Вось вам прыклад з тактыкі: румыны чатыры разы за матч гулялі персанальна з Сяргеем Рутэнкам, але ўсё роўна пакідалі яго. Чаму? Таму што, напэўна, іншыя таксама добра гулялі. Магчыма, калі б больш пільна сачылі за Рутэнкам, ён бы і не запісаў на свой рахунак 11 галоў.

**— Як ставіцеся да крытыкі?**

— Заўжды пазітыўна. Толькі ведаць трэба, хто крытыкуе, ці заслугоўваем яе? Каманда перамагла, за што крытыкаваць? Але няхай. У мяне прэтэнзій няма — каманда выканала задачу. Лічу, што ў дадзены момант гэта неапраўданая крытыка. Ведаеце, у нас шмат спецыялістаў, якія пішуць: «Вось, зборная аднаго Рутэнкі». Так-так, ён лідар, на ім пабудавана каманда, але на падобных гандбалістах фарміруюцца і іншыя каманды. У чэхаў адзіны Філіп Йіха, і яны ўжо задаволеныя. Не трэба казаць, што ў нас адзіны Сяргей Рутэнка, трэба радавацца таму, што ён у нас ёсць. Дарэчы, хочацца сардэчна падзякаваць нашым балельшчыкам, якіх з кожным матчам становіцца ўсё больш і больш на трыбунах. Спадзяюся, на хатнім матчы супраць Славакіі на «Мінск-Арэне» атмасфера будзе выдатная.

**— Вы — трэнер, які працаваў з цудоўнымі нямецкімі клубамі «Лемга», эсэнскім ТУСЕМам і «Райн Левенам», аднак пасля ўзначаліў зборную Беларусі. Ці складана было перайсці на новыя рэйкі?**

— У мяне часта пытаюцца, чаму я не працую з клубам. Прапаноў сапраўды шмат. Толькі зараз праца ў зборнай — гэта новы этап, жаданне паспрабаваць нешта новае. І зараз, у дадзены момант, мне ўсё падабаецца.

**— А ці давяраюць там беларусам?**

— У Германіі працуе і Георгій Свірыдзенка, і Генадзь Халепа. Там паважаюць моцных. І калі мы ўзнімемся, беларускія гандбалісты будуць гуляць там таксама. Нашу зборную ўжо сталі паважаць. Нас запрашаюць на буйныя спаборніцтвы, а раней казалі, што Беларусь ніхто не запрашае. Так, пэўны прагрэс у нашым гандболе ёсць.

**— У плэй-оф беларусы трапілі на Славакію. Аматары інтэрнэт-форумаў з аптымізмам успрынялі вынік лёсавання, але мала хто ўзгадаў пра небяспеку славакаў. Іх зборная — удзельнік апошняга чэмпіянату Еўропы.**

— Я форумы не чытаю, стаўлюся да іх не вельмі добра. Раней гэта называлі ананімкай — лістом без подпісу. І я не ведаю, што за людзі знаходзяцца за гэтымі паведамленнямі. Мне здаецца, што лёсаванне ўдалае (падобных поглядаў і славакі) і ў нас ёсць шанц, якім можна скарыстацца пры добрай, упартай працы.

**— У славакаў нядаўна змяніўся трэнер. Узначаліў каманду Петэр Давід.**

— Ён другі год трэніруе нямецкі «Гросвальштадт». Дагэтуль працаваў з моладзевай зборнай Славакіі. Асабіста з ім не сустракаўся, бо яго яшчэ не было ў Германіі, калі я працаваў у Бундэслізе. Зараз прыйшоў новы трэнер і ніхто не ведае, каго ён запросіць у каманду. Славакі гуляюць у даволі розных лігах. Даволі вопытныя гандбалісты. Думаю, у красавіку, пасля турніру ў Нарвегіі, у якім прыме ўдзел Славакія, пра гэтую каманду можна ўжо будзе сказаць нешта канкрэтнае.

**— А як беларусы будуць рыхтавацца да чэрвеньскіх матчаў?**

— У нас будуць зборы. Першы — на пачатку красавіка. Будзем удзельнічаць таксама ў турнірах, але пакуль усё ў стадыі распрацоўкі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Фота Пятра ФАМІНА.

Уладзімір КОПАЦЬ:

## «Сваю хвіліну славы мы атрымалі»

**Гэтымі днямі споўнілася роўна дзесяць гадоў самай гучнай беларускай перамозе ў хакеі. 20 лютага 2002 года на Алімпійскіх гульнях у Солт-Лэйк-Сіці наша каманда ў чвэрцьфінале абыграла аднаго з фаварытаў хакейнага турніру зборную Швецыі.**

Былы абаронца хакейнай зборнай і аўтар пераможнай шайбы ў вароты шведаў узгадвае, якой была тая сенсацыйная перамога

Алімпіяда ў Солт-Лэйк-Сіці была для беларусаў мінімальнай па колькасці медалёў — тады гэта ўсяго толькі бронза Аляксея Грышына ў фрыстайле. Гульні-2002 былі багатымі на скандалы і сенсацыі. А адной з сапраўдных спартыўных сенсацый стала тады наша хакейная зборная, якая выйграла ў каманды Швецыі з лікам 4:3.

Якой была гэта перамога над шведамі, мы ўзгадаем у адным з бліжэйшых нумароў у інтэрв'ю з экс-абаронцам зборнай Уладзімірам Копацем.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# «БРЭСЦКАЯ ЛЫЖНЯ-2012»: НАС НЕ ДАГОНІШ



Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

**МІНУЛЫЯ выхадныя для Брэстчыны сталі па-сапраўднаму спартыўнымі, дакладней — лыжнымі. У наваколлі Баранавіч, на тэрыторыі саўгаса-камбіната «Мір», прайшлі традыцыйныя спаборніцтвы «Брэсцкая лыжня-2012».**

Трэба сказаць, што ранішні «злёт» лыжнага актыву гэтага рэгіёна, нягледзячы на заканчэнне другой дэкады лютага, супаў больш чым з 20-градуснымі маразамі. Таму суботнія старты намаганнямі начальніка ўпраўлення спорту Брэсцкага аблвыканкама Мікалая Хевука былі перанесены на гадзіну пазней — на 12.00. Як-ніяк, а «асвойваць» лыжню прыехалі не толькі дарослыя «дзядзькі» з сілавых структур, навучальных устаноў, райвыканкамаў і сельсаветаў, але і шмат школьнікаў. Таму карэкціроўка на мясцовасці была якраз да месца. У прызначаны час ужо паспела выглянуць сонца. А калі ў межах стартавай адзнакі з'явіўся кіраўнік Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар у поўнай лыжнай экіпіроўцы, стала зразумела — лыжні быць.





Фота Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.

На ўрачыстым адкрыцці спаборніцтваў Канстанцін Андрэевіч падкрэсліў, што цяперашнія старты — гэта працяг спартыўнай праграмы Брэстчыны, якая ў рамках адпаведнай дзяржаўнай палітыкі працягваецца цэлы год. Таму перад лыжнёй пад Баранавічамі ў актыве актывістаў-спартсменаў вобласці — больш за 80 мерапрыемстваў. У завяршэнні свайго выступлення старшыня аблвыканкама пажадаў усім лёгкага бегу, а самае галоўнае — набрацца на свежым паветры здароўя, атрымаць станоўчы зарад.

У выніку выступленне старшыні аблвыканкама стала пралогам некалькіх гадзін лыжных спаборніцтваў. Пры гэтым першы чалавек у вобласці і на лыжні быў ў ліку першых, намотваючы ў адвольным фармаце адзін круг за другім і ўважліва назіраючы за тым, што адбываецца навокал.

Не замерзнуць у гэты суботні дзень лыжнікам дапамагалі не толькі не страчаныя яшчэ навыкі фізічнага выхавання, але і гарачы чай і салдацкая каша, якія арганізатары цяперашніх стартаў прызапасілі для ўсіх удзельнікаў спартыўнага свята ў неабмежаванай колькасці.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

## ОАО «Белгалантерея»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ**
**22 марта 2012 года ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях развития ОАО «Белгалантерея» на 2012 год.
2. О заключении ревизионной комиссии и аудиторской проверки по результатам деятельности Общества за 2011 год.
3. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Белгалантерея» за 2011 год по состоянию на 01.01.2012 г.
4. Об утверждении распределения чистой прибыли и выплате дивидендов за 2011 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2012 год и периодичности выплаты дивидендов за 2012 год.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов наблюдательного совета.
8. Избрание членов ревизионной комиссии.
9. О совершении крупной сделки.

Место проведения собрания: **г. Минск, ул. Ботаническая, 5А, актовый зал, 6-й этаж.**

Время начала проведения собрания — **15.00.**

Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 14.00 до 14.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителям акционеров — по доверенности.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 12 марта 2011 года.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания — в рабочие дни, начиная **с 15 марта 2011 года,** по месту нахождения Общества, в день проведения собрания — по месту проведения собрания.

УНП 100230667

# «АЛЁ, У МЯНЕ ПЫТАННЕ НАКОНТ ПЕНСІІ...»

Працяг тэмы

**Як паведамлялася, камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама правёў прамую лінію, прысвечаную пенсійнаму заканадаўству. У нумары за 17. 02. 2012 г. мы пачалі публікацыю найбольш распаўсюджаных пытанняў, адказы на якія, мы спадзяёмся, будуць карысныя і нашым чытачам.**

***Ігар Каткавец.*** *У СМІ часта згадваецца выраз «максімальная пенсія». Каму яна прызначаецца?*

Згодна з дзейным пенсійным заканадаўствам, памер пенсіі залежыць ад працягласці стажу працы і велічыні заработнай платы, з якой выплачваліся страхавыя ўзносы. Паказчыкам велічыні заробку, які меў пенсіянер, з'яўляецца індывідуальны каэфіцыент заробку, які атрымліваецца шляхам суаднясення штомесячнага фактычнага заробку пенсіянера і сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы ў тых жа месяцах.

Максімальны памер пенсіі вызначаецца пры індывідуальным каэфіцыенце заробку 4,0 і стажы работы 40 гадоў для жанчын і 45 гадоў для мужчын.

***Вольга Максімава.*** *Пасля прызначэння пенсіі па ўзросце ў Расійскай Федэрацыі ў 2010 годзе пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў Рэспубліку Беларусь. Паколькі ад расійскага грамадзянства я не адмаўлялася, пры звароце ў органы сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь я выказала жаданне і надалей атрымліваць пенсію ад Расіі. У цяперашні час перавод маёй пенсіі ажыццяўляецца раз у квартал у беларускіх рублях на рахунак, адкрыты ў банку. Ці правамерна гэта? Ці магу я атрымліваць сваю пенсію штомесяц у расійскіх рублях?*

Парадак выплаты пенсій, прызначаных у адпаведнасці з Дагаворам паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння ад 24.01.2006, урэгуляваны адпаведным пагадненнем, заключаным бакамі 15.03.2011. Названы дакумент прадугледжвае, што перавод сум пенсій і іх выплата ажыццяўляюцца раз на квартал (да 15-га чысла апошняга месяца квартала) у нацыянальнай валюце той краіны, на тэрыторыі якой асоба пражывае. Пры гэтым выкарыстоўваюцца курсы валют, афіцыйна апублікаваныя адпаведна Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і Цэнтральным Банкам Расійскай Федэрацыі на дзень складання аплатнай ведамасці. Іншы парадак выплаты пенсій не прадугледжаны.

***Аляксандра Коцінава.*** *Маю стаж 36 гадоў, але за гады працы ў кааператыве (1993-1996) згублены архіўныя дакументы аб заробку, пры прызначэнні пенсіі заробак за гэтыя гады мне ўзялі нулям. Як можна аднавіць заробак?*

Даведка аб памеры заробку за перыяды работы да 1 студзеня 2003 г., прадастаўляемая для вылічэння пенсіі, выдаецца працадаўцам на падставе асабовых рахункаў і іншых дакументаў аб налічанай і выплачанай заработнай плаце, а ў выпадку спынення дзейнасці працадаўцы — яго правапераемнікам, архівам, органам, які ажыццявіў дзяржаўную рэгістрацыю юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, ці арганізацыяй, у якой знаходзяцца на захоўванні бухгалтарскія дакументы.

У тым выпадку, калі прадпрыемства ліквідавана, правапераемніка няма, а дакументы на захоўванне ў архіў не здадзены, то ўстанавіць звесткі аб памеры заробку, неабходнага для прызначэння і пераразліку пенсіі, можна ў судовым парадку.

Пры разглядзе такой катэгорыі спраў судом прымаюцца любыя сродкі доказвання, прадугледжаныя ў грамадзянскім судаводстве. Так, напрыклад, памер заробку можа быць пацверджаны дакументамі, якія ўскосна сведчаць аб фактычным заробку: выпіскай са штатнага раскладу аб акладзе на адпаведнай пасадзе, укладышам да працоўнай кніжкі, разліковымі кніжкамі (ліасткамі), іншымі доказамі, у тым ліку паказаннямі сведак.

Пры наяўнасці падстаў суд выносіць рашэнне аб устанаўленні факта атрымання заяўнікам заробку за пэўны перыяд у вызначаным памеры. Рашэнне суда, якое ўступіла ў законную сілу, прадастаўляецца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па месцы атрымання пенсіі для вырашэння пытання аб пераразліку пенсіі.

***Міхаіл Залескі.*** *З'яўляюся атрымальнікам пенсіі па ўзросце. У лютым 2012 года мне споўнілася 80 гадоў. Якія надбаўкі і павышэнні прадугледжаны мне да пенсіі?*

У адпаведнасці з артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» з сакавіка 2012 г. вам будзе выплачвацца надбаўка на догляд як асобе, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, у памеры 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце, што складае 88 360 рублёў. Акрамя гэтага, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.01.2012 № 35, да вашай пенсіі, калі вы не працуеце, будзе ўстаноўлена даплата ў памеры 100 працэнтаў мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце, г.зн. 176 720 рублёў.

***Ірына Міхайлаўна.*** *Да пачатку працоўнай дзейнасці я вучылася 2 гады ў тэхнікуме, але не скончыла яго. Ці будзе мне залічаны час навучання ў стаж, і як мне яго пацвердзіць, бо дыплома аб заканчэнні тэхнікума я не маю?*

Дзейнае пенсійнае заканадаўства прадугледжвае магчымасць уключэння ў стаж працы для прызначэння пенсіі часу навучання на дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, а таксама ў аспірантуры, клінічнай ардынатуры, дактарантуры[1].

У выпадку, калі асоба па якіх-небудзь прычынах не скончыла поўны курс навучання ў навучальнай установе і не мае адпаведнага дакумента аб адукацыі, час навучання пацвярджаецца даведкай аб фактычным перыядзе навучання на дзённай форме, выдадзенай навучальнай установай на падставе загадаў аб залічэнні і адлічэнні з ліку навучэнцаў.

Аналагічны дакумент павінны будуць прадаставіць і тыя, хто скончыў навучальную ўстанову і мае дакумент аб адукацыі, але частка перыяду навучання прыпадала на завочную або вячэрнюю формы навучання. У гэтым выпадку падлягае ўключэнню ў стаж фактычны перыяд навучання на дзённай форме, вызначаны на падставе загадаў аб пераводзе на іншую форму навучання.

*[1]Да ўстаноў (іх падраздзяленняў), якія забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў, адносяцца акадэмія, інстытут, вучэбны цэнтр, вучэбны камбінат, вучэбна-курсавы камбінат, факультэт і спецыяльны факультэт вышэйшай навучальнай установы, аддзяленне ўстановы, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, курсы, вучэбны пункт (артыкул 43 Закона).*

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

***Удакладненне.*** *У нумары «Звязды» за 17.02.2012, дзе была надрукавана першая частка артыкула «Алё, у мяне пытанне наконт пенсіі...» замест «Доўгі час не працую, ажыццяўляю догляд сына, інваліда з дзяцінства 1 групы. У наступным годзе мне споўніцца 60 гадоў...» трэба чытаць «Доўгі час не працую, ажыццяўляю догляд сына, інваліда з дзяцінства 1 групы. У наступным годзе мне споўніцца 55 гадоў...».*

## ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

**г. Минск, ул. Богдановича, 129**

**СООБЩАЕТ, что 23 марта 2012 года в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123 г. Минск, ул. Богдановича, 129 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Об основных направлениях хозяйственной деятельности Общества на 2012 год. Отчет генерального директора Общества.
2. О рассмотрении Заключения ревизионной комиссии по результатам проведения ежегодной ревизии деятельности Общества за 2011 год.
3. О рассмотрении Аудиторского заключения, подготовленного по результатам проведения ежегодного аудита Общества.
4. Утверждение годового отчета Общества за 2011 год, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2011 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли в 2012 году. О порядке и сроках выплаты дивидендов по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2011 год.
6. Утверждение отдельных решений, принятых Советом директоров.
7. Утверждение изменений в Устав Общества.
8. Избрание членов Совета директоров Общества.
9. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
10. О вознаграждении членов Совета директоров и ревизионной комиссии.

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 22 февраля 2012 года. С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 129 (отдел ценных бумаг) с 16 марта 2012 г.

**Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт; представителю акционера — паспорт и доверенность.**

**Сведения по телефонам: 334 30 31, 334 33 83.**

УНП 100364117

**Совет директоров.**

## ОАО «Минскгрузавтотранс»

**извещает своих акционеров о проведении 22 марта 2012 года очередного собрания акционеров.**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году и основных направлениях деятельности Общества на 2012 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета Общества в отчетном периоде.
3. О результатах проверки аудитором и ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2011 году.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2011 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2011 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2012 год.
6. Установление размера материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии, избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2. (2 этаж, к. 1). Начало собрания в 15.00.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 11) в рабочие дни в период с 12 по 21 марта 2012 года с 08.30 до 13.30, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 в день и по месту проведения собрания — по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а для представителя акционера — также доверенности или договора.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 01 марта 2012 года.

Справки по тел. (8 017) 222 98 24.

**Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».**

*УНП 100028545*

**Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ»**
**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ**
**23 марта 2012 года в 14 часов в зале заседаний ОАО «БЭМЗ»**
**по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202**
**ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2011 год, распределения прибыли и убытков Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидентов за 2011 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2012 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 13 часов. Акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров — паспорт и доверенность. Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01 марта 2012 года.

Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница) начиная с 14 марта 2012 года в отделе кадров ОАО «БЭМЗ», 23 марта по месту проведения собрания.

**Справки по телефону 42 16 83.**

УНП 200032892

***Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ»***

## ОАО «АМКОДОР-ДЗЕРЖИНСК»

**222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Собрание состоится 22 марта 2012 года в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19. Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.45.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2012 год.
2. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
3. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2011 год. Утверждение направлений распределения прибыли на 2012 год.
4. Об избрании членов Совета директоров, Ревизионной комиссии.

Основание созыва собрания — решение Совета директоров Общества от 7 февраля 2012 года.

УНП 600005769

*Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск».*

## Открытое акционерное общество «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 5»

**(г. Минск, ул. Широкая, 26)**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ**
**23 марта 2012 г. в 11.00 ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**
**по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26 (актовый зал).**
**Форма проведения собрания: очная.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О внесении изменений в устав Общества.
2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерских балансов, отчетов о прибылях и убытках Общества и распределение прибыли (в том числе выплата (объявление) дивидендов) и убытков Общества при наличии и с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Об утверждении направлений использования (распределения) чистой прибыли Общества за 2011 год.
4. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
5. Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета, ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26, отдел правовой кадровой и спецработы (юрисконсульт) по рабочим дням с 14 марта 2012 года по 22 марта 2012 года с 8.00 до 17.00 (понедельник-четверг) и с 8.00 до 15.45 (пятница), тел. для справок (017) 262 86 29.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание: 23 марта 2012 года с 09.30 до 10.45 по месту проведения собрания. При себе иметь документ, удостоверяющий личность (паспорт), представителю акционера – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и документ, подтверждающий его полномочия (доверенность или договор).

УНП 100219908

## Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»

**28 марта 2012 года СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛХИМ», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34.**

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34, в 16.00.**

УНП 100122846

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет генерального директора ОАО «Белхим» Маталовой Т.И. об итогах финансово-экономической деятельности общества в 2011 году и основных направлениях развития на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году и 1 квартале 2012 г.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белхим» за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков общества.
5. Распределение чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направления использования остатка чистой прибыли на 2012 год и 1-ый квартал 2013 г.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
8. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Утверждение сметы командировочных расходов на 2012 год и 1 квартал 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34, с 12 марта по 28 марта 2012 года (время работы с 9.00 до 16.30) либо 28 марта 2012 года по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 20 марта 2012 года.

Регистрация участников собрания — 28 марта 2012 года с 14.00 до 16.00 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 28 марта 2012 года в 16 часов 00 минут.

Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность.

## ОАО «Технолит Полоцк»

**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 23 марта 2012 г. в 14.00 ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

по адресу: г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (актовый зал ОАО «Технолит Полоцк»).

**Повестка дня очередного Общего собрания акционеров:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году.
3. О результатах проверки контрольно-ревизионным управлением Министерства промышленности Республики Беларусь и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2011 год, распределение прибыли и убытков Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2012 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии Общества.
8. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (кабинет председателя НС) в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная **с 14 марта 2012 г. с 9.00 до 16.00**.

Регистрация участников собрания будет производиться с **12.45 до 13.45** в день и по месту проведения собрания на основании: акционер – паспорт; представитель – паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 августа 2006 г. № 1093 «Об утверждении Инструкции о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями».

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 1 марта 2012 г.

УНП 300083521

***Наблюдательный совет ОАО «Технолит Полоцк»***

**28 марта 2012 года в 12.00 состоится очередное общее СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ПРОМТОВАРЫ-ПИНСК» по адресу: г. Пинск, пл. Ленина, 4.**

Начало регистрации участников собрания — 11.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основные направления деятельности Общества в 2012 году.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчетов о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2011 год.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2012 и в первом квартале 2013 года.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
7. О материальном вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
8. О сделках Общества.

*УНП 200181862*

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ 29 февраля 2012 года ПО ПРОДАЖЕ ТРАНСПОРТНОГО СРЕДСТВА ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

| № | Наименование транспортного средства, его характеристики | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1. | Грузопассажирский автомобиль Форд-Транзит, 1998 года выпуска, № кузова – Y4FHXXR9VHWU02724, цвет – белый, тип топлива – бензин, объем двигателя – 2000 см³, пробег – 699 764 км. | 17 675 000 | 883 750 |

Аукцион состоится **29 февраля 2012 года в 11.00** по адресу: г. Жабинка, клуб завода.

Аукцион проводится методом повышения начальной цены лотов. Шаг торгов – 5% начальной цены лота.

Заявление на участие в аукционе составляется в произвольной форме.

Задаток вносится на расчетный счет 3012750125417 в ЦБУ № 109 г. Жабинка, ул. Советская, 7, МФО 150501246, УНН 200037600, получатель платежа ОАО «Жабинковский сахарный завод».

Наименование платежа: задаток для участия в аукционе по продаже транспортных средств. Срок внесения задатка – **по 28 февраля 2012 года включительно.** Внесение задатка и окончательный расчет осуществляются только безналичным путем.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Жабинка, ОАО «Жабинковский сахарный завод», административное здание, каб. № 9 по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **по 28 февраля 2012 года включительно.**

**Телефоны для справок: 8 (029) 136 27 87, 8 (01641) 2 73 62.**

Более подробная информация об условиях проведения и участия в аукционе размещена на сайте **www.sahar.by** в разделе маркетинг, вкладка – продажа оборудования.

## РУП «Белспецконтракт»

Дополнительная информация к извещению о проведении аукциона, опубликованному в газете «Звязда» № 32 от 17 февраля 2012 года.

Лоты №№ 32, 33, 34, 35, 36, 37, 38, 39 следует читать: 32а, 33а, 34а, 35а, 36а, 37а, 38а, 39а. Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 32 от 17 февраля 2012 года.

*УНП 101099370*

## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

### Аукцион состоится 23 марта 2012 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Целевое назначение земельного участка (назначение в соответствии с единой классификацией) | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | улица Актюбинская, в районе жилого дома № 11 | 0,0060 | 2 года | размещение объекта розничной торговли (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 740100000002005853 | 2 102 646 | 1 981 000 | 376 000 |
| № 2 | улица Б. Бирули, в районе остановки «Дом Ветеранов» (в центр), ограничения – газопровод | 0,0036 | 3 года | размещение объекта финансового назначения (код 1 16 02, земельный участок для размещения объектов финансового назначения) | 740100000001006245 | 2 471 384 | 1 132 000 | 215 000 |
| № 3 | переулок Гоголя, в районе жилых домов №№ 15а, 17, ограничения – канализация | 0,0109 | 2 года | размещение объекта розничной торговли (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 740100000002005852 | 1 361 579 | 3 868 000 | 735 000 |
| № 4 | микрорайон жилой застройки «Спутник» | 0,0320 | 50 лет | строительство и обслуживание магазина товаров повседневного спроса №75 по генплану (код 1 16 03, земельный участок для размещения объектов розничной торговли) | 740100000001006246 | 1 426 418 | 60 539 000 | 11 502 000 |

**Принимать участие в аукционе имеют право граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающими принять участие в аукционе представляются **паспорт**, а также следующие документы:

Документ, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков**) на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж), **с отметкой банка**.

**Гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность.

**Индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя; **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность.

**Представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких земельных участков**, вносят **задатки** в размере, установленном **для каждого из предметов аукциона**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации; земельный участок для нового строительства – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с материалами землеустроительного дела всем желающим.

5) **Победитель** аукциона либо **единственный участник** несостоявшегося аукциона **обязан** в течение **10 рабочих дней** со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся **внести плату за право заключения договора аренды земельного участка** (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения)**, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона составляет 13 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 19.03.2012 года до 17.00**.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

## ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЛОГОЙСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

# ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

### по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Расходы по подготовке документов | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Чеботари, участок № 3, 623287610101000035 | 0,1908 | 2 619 932 | 6 678 000 | 814 800 |
| 2 | д. Кроква, участок № 5, 623287603101000065 | 0,1993 | 2 619 932 | 8 968 500 | 1 043 850 |
| 3 | д. Погребище, участок № 9, 623287607101000069 | 0,1779 | 2 619 932 | 8 895 000 | 1 036 500 |
| 4 | д. Таковщина, участок № 10, 623287608601000047 | 0,1800 | 2 619 932 | 9 000 000 | 1 047 000 |
| 5 | д. Молоди, участок № 22, 623287605101000103 | 0,1707 | 2 598 910 | 10 242 000 | 1 171 200 |
| 6 | д. Морозовка, участок № 12, 623287605601000009 | 0,2500 | 2 333 110 | 8 750 000 | 1 022 000 |
| 7 | д. Заберезовка, участок № 2, 623287601601000028 | 0,1880 | 2 619 932 | 11 280 000 | 1 275 000 |
| 8 | д. Заберезовка, участок № 3, 623287601601000029 | 0,1811 | 2 619 932 | 10 866 000 | 1 233 600 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **21 марта 2012 года в 14.00** по адресу: Минская обл., Логойский р-н, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26.

**Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 14.00 16 марта 2012 года.**

**Контактные телефоны: 8 (01774) 59 1 35, 59 2 35, 8 (029) 107 16 17.**

**Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by**

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.*

**РАЗНАСТАЙНЫ СПЕЦЫЯЛІСТ**

**Намеснік старшыні Беларускай федэрацыі шашак Віталь Варушыла — нацыянальны майстар у гэтым інтэлектуальным відзе спорту. Захапляецца не толькі практычнай гульнёй, але і кампазіцыяй, узначальвае па ёй Рэспубліканскую камісію. Дзякуючы мэтанакіраванай працы пад яго кіраўніцтвам, беларускія складальнікі камбінацый, эцюдаў і задач зрабілі сапраўдны прарыў: за перамогі ў спаборніцтвах Васіль Грабенка (Мінск) атрымаў дыплом міжнароднага майстра, Аляксандр Сапегін (Усполле Мсціслаўскага раёна), Аляксандр Кагоцька (Пінск) і Пётр Шклудаў (Наваполацк) сталі майстрамі ФМЖД. Уручаны дыпломы: Леаніду Вітошкіну (Гомель) — міжнароднага гросмайстра ганаровай ступені, Мікалаю Грушэўскаму — міжнароднага арбітра. Істотна дапамагае В. Варушылу член камісіі Віктар Шульга, які адначасова прадэманстраваў высокі клас асабістага выступлення ў чэмпіянаце свету: заваяваўшы ў ім бронзавы медаль, першым з беларусаў папоўніў рады міжнародных майстроў.**

**В. Варушыла вядомы і як прапагандыст старадаўняй гульні: у газеце «Спортивная панорама» змястоўна вядзе рубрыку «Шашки». Пазнаёмцеся з яго канструкцыяй 7 на 7 на 64-клетачнай дошцы:**





**Белыя:** b6, c5, c7, e3, g3, h2, h4 (7). **Чорныя:** a3, a7, b4, c3, d8, e5, h6 (7). Яна мае два рашэнні, але яны ў даным выпадку не лічацца пабочнымі, бо кампазіцыйныя. Пашукайце іх самастойна. Прозвішчы правільна рашыўшых будуць апублікаваныя. Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

**ДАДАТКОВЫЯ РАЗВЯЗКІ**

У нашых конкурсах лідзіруюць І. Ананіч (Гродна), А. Белы (Наваполацк), Л. Вітошкін (Гомель), А. Камінская (Вілейка), А. Кіслы (Узда), А. Пярхальскі (Глыбокае), У. Сапяжынскі (Рагачоў), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна) і А. Шурпін (Клімавічы). Дапытлівыя аналітыкі заўважылі дадатковыя развязкі ў заданнях конкурсаў: «Пагода ў доме»-8 — № 1. 1. g7/1. b8x, № 7. 1. c5/1. e5x і № 11. 1. d8/1. cb8x; аўтарскага-13 — №6. 1. b8 2. g5/2. b8x, № 16. 1. ab8/1. ba3/1. fe3/1. fg3x, № 20. 1. cb8 gh6 2. h2/2. cb6x і № 23. 1. d4-c3/1. bc3/1. ab4/1. d2-c3#; аўтарскага-14 — № 15. 5. 7/5. 49x у варыянце 1. 47 (40) і № 17. 1. 25 (40) 14 (44, 34) 29 (24) 32x/4 (30) 15 (43) 38x. Убачылі іх і ў бліцах: 56/4 — 6. 39-33/34 (45) 1x, 57/1 — 1. cb4 gf6 2. e:g7 ba5 3. d:d8 a:h8? 4. da5=, 58/3 — 1. f4/g7/c5/a5x, 60/4 — e5 (g3!) a5 (h2)= і 61/4 — (24-29, 17-22) 26:17 (33) 29 (31, 25)x з лішняй шашкай.

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

**«Пагода ў доме»-8/22** (М. Грушэўскі). Заданне залічана тым, хто даказаў у ім нічыю: gf4 (cb6, d6) b4 (b6) d4 (f6) fg3!, hg3!, a5 (fg5) e5, f6 (g3) e7 (f2) d8=.

**Аўтарскі-15/1** (П. Шклудаў): b2 (b6A) a7, ec5, c1+. A(d2) d8, e1+.

# КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

## «У нас сягоння Масленіца»



**Па гарызанталі:** 1. Прыправа для стравы. 4. Адна з народных назваў Стрэчання. 7. Люты будуе ..., а сакавік яго ломіць (прык.). 8. У лютым сонца ідзе на лета, а ... на мароз (прык.). 10. «А ў нас сягоння Масленіца, Масленіца,\\Прыляцела ..., ....\\ Села-пала на жэрдачку,\\Шчабятала вестачку». З народнай масленічнай песні. 14. Музычна-драматычны твор. 15. Пасудзіна, у якой што-небудзь таўкуць; на Масленіцу хлопцам, што не жэняцца, прывязвалі ... да нагі і патрабавалі магарыч. 16. Адвар з траў, ягад. 17. Навошта той ..., калі ў дзетках лад (прык.). 18. Снегу навее — хлеба прыбудзе, ... разальецца — сена набярэцца (прык.). 21. Пра калючыя расліны, а таксама пра калючкі на іх. 22. Масленіца — палізуха: сыр і ... палізала (прык.). 24. Невялікая эстрадная п'еса. 28. ... нядзеля. Адна з апошняга дня масленічнага тыдня, калі сямейнікі прасілі адзін у аднаго прабачэння за ўсе крыўды і грахі, а на вячэру гатаваліся толькі малочныя стравы. 30. Геаметрычны абрадавы сімвал, які ўвасабляе ўрадлівасць. 31. Інструмент у выглядзе завостранага стрыжня; у першы панядзелак пасля Масленіцы ім чысцілі зубы ад скаромнага. Таму гэты дзень называўся «Шыльны панядзелак» і «Паласказуб». 32. Даведнік па лекавых раслінах. 33. Урачысты абрад шлюбу, які раілася рабіць у мясаедныя дні: ад Калядаў і да Масленіцы.

**Па вертыкалі:** 2. ... падняў хвост, а мне Масленіца (прык.). 3. Вол бушуе — вясну чуе,\\... крача — сыру хоча (з песні). 5. Рака на Беларусі, левы прыток р.Сож. 6. Мучны выраб, які сімвалізуе на маслянічным свяце вясновае сонейка, а спажыванне яго сімвалізуе далучэнне да жыватворнай моцы. 7. ... Студзёны. Свята, якое адзначалася 17 лютага, калі надыходзіць час звярыных вяселляў. У народзе казалі: «... Студзёны — воўчы сват». 9. Вёска ў Мінскім раёне, дзе на сядзібе Музея народнай архітэктуры і побыту штогод адбываецца захапляльнае святкаванне Масленіцы; сёлета святкаванне ў ... адбудзецца 19 і 26 лютага. 11. Страва з дробных кавалачкаў мяса. 12. Месца, дзе растаў снег і агалілася зямля. 13. «Нашы ... гуллівы,\\Штось ...,\\Люлі, гуллівы!». З народнай масленічнай песні «Наша Масленка». 19. Галоўны дзень на масленічным тыдні, у які ўшаноўваўся святы Уласій, наступнік старажытнага беларускага бога Вялеса. 20. Саламянае ... або пудзіла; на провадах Масленіцы яго спальвалі, што сімвалізавала развітанне з зімой і збаўленне ад нечысці. 23. Дзе сава і ..., там носа не тыч (прык.). 25. Прыстасаванне для гушкання, нязменнага атрыбута Масленіцы. 26. У лютага два сябры — ... і віхура (прык.). 27. У каталіцкай царкве літургія, абедня. 29. Пэўная група навук, аб'яднаных па агульным прынцыпе.

**Адказы на крыжаванку:**

**Па гарызанталі:** 1. Заправа. 4. Зімабор. 7. Мост. 8. Зіма. 10. Ластаўка. 14. Опера. 15. Ступа. 16. Узвар. 17. Клад. 18. Вада. 21. Церні. 22. Масла. 24. Скетч. 28. Прошчаная. 30. Ромб. 31. Шыла. 32. Траўнік. 33. Вяселле.

**Па вертыкалі:** 2. Пост. 3. Воран. 5. Іпуць. 6. Блін. 7. Мікола. 9. Азярцо. 11. Азу. 12. Праталіна. 13. Дзеванькі. 19. Чацвер. 20. Чучала. 23. Сыч. 25. Арэлі. 26. Завея. 27. Імша. 29. Цыкл.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.18 | 18.29 | 10.11 |
| Віцебск — | 8.10 | 18.16 | 10.06 |
| Магілёў — | 8.08 | 18.19 | 10.11 |
| Гомель — | 8.01 | 18.19 | 10.18 |
| Гродна — | 8.32 | 18.45 | 10.13 |
| Брэст — | 8.30 | 18.49 | 10.19 |

**Месяц**

*Маладзік 22 лютага. Месяц у сузор'і Рыбаў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Андрэя, Захара, Сямёна, Фёдара.*

***К.*** *Ірэны, Элеаноры, Яўгеніі, Барталамея, Фелікса, Цэзара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 21 лютага

**Дзве даты**

**1947 год** — нарадзіўся (горад Мазыр) Міхаіл Фінберг, дырыжор, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990), народны артыст Беларусі (1994). З 1987 года — дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь. Прапагандуе музыку беларускіх кампазітараў. Арганізатар, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор многіх рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1990), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996). Узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны.



**1848 год** — Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс надрукавалі «Маніфест камуністычнай партыі», у якім аўтары дэкларуюць і абгрунтоўваюць мэты, задачы і метады барацьбы камуністычных арганізацый і партый. Маркс і Энгельс абвяшчаюць няўхільнасць гібелі капіталізму ад рук пралетарыяту. Маніфест пачынаецца словамі: «Прывід блукае па Еўропе — прывід камунізму», а заканчваецца знакамітым гістарычным лозунгам: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!».

**Цытата дня:**

*«Лепей спазніцца, чым не ў часе схапіцца».*

**Якуб Колас (1882—1956), народны паэт Беларусі.**

## Усходні гараскоп на тыдзень

## Львам самы час паэксперыментаваць са знешнасцю, а Шаляў чакаюць спрыяльныя змены ў жыцці

**АВЕН.** Тыдзень поўны актыўнасці і нечаканых сустрэч пры спрыяльных акалічнасцях. Вашы памкненні будуць моцныя, а праявы волі — непахісныя. Нягледзячы на гэта або дзякуючы гэтаму, блізкім захочацца хоць як-небудзь дапамагчы вам у пасоўванні да мэт, якіх вы хочаце дасягнуць. У чацвер можа наведаць расчараванне — зрэшты, ужо наступны дзень падніме настрой.

**ЦЯЛЕЦ.** Неабходна прадумаць стратэгію будучых дзеянняў. Рэальны шанц увасаблення ў жыццё раней задуманага ў кар'еры і сацыяльнай сферы. Поспех цалкам магчымы, але ў першай палове тыдня не варта прадпрымаць рашучых дзеянняў, тым больш у новых абласцях дзейнасці. Дапамога сяброў або звароты да начальства могуць не дасягнуць мэты, да таго ж варта кантраляваць свае ілюзіі і пазбягаць занадта прывабных прапаноў. Належыць таксама прымаць да ўвагі настрой навакольных.

**БЛІЗНЯТЫ.** Добрае самаадчуванне, сілы і энергія — вось што чакае вас на гэтым тыдні. Не адмаўляйцеся ад выгадных прапаноў, бо час для іх досыць спрыяльны. Паспрабуйце не ўступаць у спрэчкі з дзелавымі партнёрамі, інакш яны могуць узбунтавацца, што пойдзе не на карысць агульнай справе. Самы час далучыцца да новых калектыўных дзеянняў і выявіць свае дзелавыя якасці і здольнасці.

**РАК.** Паспрабуйце не прымаць сур'ёзна выбрыкі вашых апанентаў і супернікаў, яны не настолькі сур'ёзныя і небяспечныя, як вам здаецца. Вучыцеся быць больш гнуткімі, прыстасоўвацца да сітуацыі — вайну можна весці і дыпламатычнымі метадамі, зусім не абавязкова разбураць усё і ўсіх агнём і мячом. А калі гэтага цяжка ад сябе дамагчыся — гуляйце! Калі ж стоміцеся ад усіх гэтых жыццёвых складанасцяў — дазвольце сабе адзіноту і спакой у выхадныя.

**ЛЕЎ.** Будуць удалымі эксперыменты са знешнасцю, а таксама паездкі і вандроўкі. У панядзелак вашу задуму, афармленую ў пісьмовым выглядзе, можа падтрымаць уплывовы чалавек. У аўторак, напэўна, захочацца навесці парадак, усё раскласці па палічках, нават уласныя думкі і пачуцці. У сярэдзіне тыдня нехта будзе пільна сачыць за вашымі справамі і зробіць высновы, якія могуць сур'ёзна паўплываць на ваш лёс. Блізкаму чалавеку спатрэбіцца парада.

**ДЗЕВА.** Жаданне пазбавіцца ад цяжару адказнасці і ўцячы ад праблем можа дрэнна скончыцца. Не спяшайцеся завяршаць справы, якія, на вашу думку, зусім блізкія да фіналу — раптам могуць выявіцца новыя акалічнасці, якія ў корані зменяць сітуацыю, і ўсё давядзецца перарабляць зноўку. Многае будзе залежаць ад начальства і аб'ёму работы, які вам давядзецца выканаць.

**ШАЛІ.** Вы можаце сутыкнуцца з нейкай спрыяльнай акалічнасцю, якая зменіць ваша жыццё. Паспрабуйце займацца справамі, якія не прэтэндуюць на глабальнасць, бо павышаная актыўнасць на гэтым тыдні не пажадана. У чацвер не прапусціце важных сустрэч і кантактаў, імкніцеся развіваць і замацоўваць усякае знаёмства. А вось у выхадныя лепш, наадварот, пазбягаць сустрэч з новымі людзьмі.

**СКАРПІЁН.** Не варта ісці супраць грамадскай думкі, бо давесці большасці, што праўда на вашым боку, будзе вельмі складана. Магчыма, лягчэй будзе пагадзіцца на варыянт, які не вельмі задавальняе вас. У сераду давядзецца энергічна вырашаць важныя пытанні, уладжваць праблемы, якія ўзнікаюць на працы або звязаны з людзьмі з вашага асяроддзя. Мэтанакіраванасць у суботу дазволіць дасягнуць значна большых вынікаў, чым меркавалася.

**СТРАЛЕЦ.** Аснова вашай паспяховасці — правільнае выкарыстанне родносных сувязяў, гарманічныя адносіны з навакольнымі і добра наладжаныя каналы паступлення інфармацыі. Стрымлівайце раздражняльнасць, бо яна не пойдзе на карысць ні ў прафесійнай сферы, ні ў асабістых кантактах. Бадзёрасць духу і выразнасць думак стануць вашымі відавочнымі перавагамі. Чацвер — спрыяльны дзень для пераходу на новую працу, рух наперад і кар'ерны рост вам будуць забяспечаныя.

**КАЗЯРОГ.** Ваш пазітыўны погляд на свет дазволіць з лёгкасцю спраўляцца нават з самымі складанымі задачамі. Адпачніце ад мітусні і клопатаў, адчуйце смак да жыцця. Выкарыстайце раптоўную сустрэчу з кіраўніцтвам у сваіх мэтах, выкажыце планы і ідэі — гэтую ініцыятыву абавязкова падтрымаюць. У вас можа з'явіцца некалькі выдатных ідэй па перабудове дома.

**ВАДАЛЕЙ.** Самавалоданне і несумнеўнае лідарства дазволяць без адмысловых намаганняў кіраваць людзьмі. З галавой паглыбіцеся ў працу, разбіраючыся з назапашанымі справамі. Не правакуйце сваімі дзеяннямі і выказваннямі незадаволенасць навакольных. Давядзецца адказваць за памылкі. Сцеражыцеся капаць каму-небудзь яму — гарантавана трапіце ў яе самі. І не займайцеся самападманам, бо перабольшваць рэчаіснасць ніколі не варта.

**РЫБЫ.** Перастаньце сябе стала параўноўваць з навакольнымі, вучыцеся любіць і паважаць сябе як унікальнага і непаўторнага чалавека. У пачатку тыдня пажадана заняцца разграбаннем назапашаных спраў. У чацвер можа паступіць цікавая прапанова новай, больш прэстыжнай працы, але для гэтага вам неабходна павысіць кваліфікацыю. У другой палове тыдня пажадана трымаць сваю думку пры сабе, асабліва на працы, інакш рызыкуеце сапсаваць адносіны з начальствам. Пры выбары аднадумцаў праявіце асцярожнасць, бо давядзецца разлічваць толькі на сваю інтуіцыю. Займіцеся домам.

## Здарэнне

# СУТЫКНУЛІСЯ ДВА «РЭНО»

**Ля вёскі Дуброўка Ушацкага раёна ў выніку сутыкнення двух «Рэно» загінула пасажырка.**

Па звестках ДАІ, а 19-й гадзіне 22-гадовы жыхар гарадскога пасёлка Падсвілле Глыбоцкага раёна, кіруючы аўтамашынай «Рэно», выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтамашынай аналагічнай маркі. У выніку аварыі пацярпела пасажырка першага аўто, 1993 года нараджэння. Ад атрыманых траўмаў у бальніцы маладая жанчына памерла.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Зваротная сувязь

# Лагапеды ўстаноў аховы здароўя перасталі быць педагогамі?

**У нумары за 25 студзеня «Звязда» змясціла артыкул «300 настаўнікаў-лагапедаў «завіслі» паміж небам і зямлёй». Нагадаем, што размова ў ім вялася аб няпростай сітуацыі, у якой апынуліся настаўнікі-лагапеды ўстаноў аховы здароўя пасля выхаду ў верасні мінулага года пастановы Міністэрства адукацыі «Аб вызначэнні скарочанай працягласці рабочага часу асобным катэгорыям педагагічных работнікаў». Фактычна пасля з'яўлення гэтага дакумента была праведзена мяжа паміж лагапедамі, якія працуюць ва ўстановах адукацыі і ўстановах аховы здароўя. У апошніх норма педагагічнай нагрузкі на стаўку ўзрасла ўдвая: з 20 да 40 гадзін. Але заробкі пры гэтым засталіся ранейшыя. Пазбавіліся яны і 56 дзён адпачынку...**

Артыкул быў накіраваны ў Міністэрства адукацыі, адкуль мы атрымалі наступны адказ:

«Міністэрства адукацыі азнаёмілася з артыкулам і на запыт рэдакцыі ў рамках сваёй кампетэнцыі паведамляе наступнае.

Настаўнікі-дэфектолагі ўстаноў адукацыі з'яўляюцца педагагічнымі работнікамі. У адпаведнасці з артыкулам 50 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, педагагічнымі работнікамі прызнаюцца асобы, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць (рэалізуюць змест адукацыйных праграм, праграм выхавання, ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі і (ці) ажыццяўляюць кіраўніцтва адукацыйнай дзейнасцю ўстаноў адукацыі, яго структурных падраздзяленняў.

Настаўнікі-дэфектолагі арганізацый аховы здароўя (акрамя іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дадзена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю пры ўмове рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі) не рэалізуюць адукацыйныя праграмы, у адпаведнасці з заканадаўствам яны не могуць быць аднесены да педагагічных работнікаў. Акрамя таго, не вырашаны і іншыя пытанні, звязаныя з прафесійнай дзейнасцю гэтых работнікаў (абгрунтаванасць наймення ў арганізацыях аховы здароўя пасады настаўніка-дэфектолага, устанаўлення кваліфікацыйных патрабаванняў да заняцця гэтай пасады, павышэння кваліфікацыі, аплаты працы, працягласці працоўнага водпуску і іншыя).

Для вырашэння гэтых пытанняў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь даў адпаведнае даручэнне Міністэрству аховы здароўя, Міністэрству працы і сацыяльнай абароны і Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь».

Шчыра кажучы, пра тое, што «праводзіцца работа па ўрэгуляванні пытання аб працягласці працоўнага часу настаўнікаў-лагапедаў сістэмы аховы здароўя», апошнія чуюць на працягу амаль што паўгода, прычым з самых розных крыніц, паколькі звярталіся за гэты час не толькі ў Міністэрства адукацыі, але і ў Міністэрства аховы здароўя, у Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, у Беларускі прафесійны саюз работнікаў аховы здароўя, і ў Камітэт па ахове здароўя Мінгарвыканкама. А пакуль «пытанне вырашаецца» і ведамствы разбіраюцца паміж сабой, хто ж усё-такі возьме лагапедаў пад сваё крыло, тыя вымушаны працаваць літаральна на знос, паколькі кіраўніцтва многіх устаноў аховы здароўя прымушае іх працаваць ад званка да званка, а гэта, між іншым, 8 гадзін штодзённай галасавой нагрузкі і непасрэдных стасункаў з пацыентамі. Ёсць установы аховы здароўя, дзе лагапедам, якія не вытрымліваюць такіх нагрузак, прапануюць працаваць чатыры гадзіны на прыёме з пацыентамі, а 4 гадзіны... масажыстамі. І людзі вымушаны звальняцца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ВЕДАЙ НАШЫХ!



ФОТАЗДЫМАК нашага фотакарэспандэнта Марыны Бегунковай увайшоў у дзясятку лепшых у свеце па выніках найбуйнейшага міжнароднага фотаконкурсу Sony World Photography Awards 2012.

На конкурс Sony World Photography Awards 2012 было пададзена 112.000 работ са 171 краіны. Журы высока ацаніла працу Марыны пра беларускі народны абрад «Русалле», які праводзіцца ў Любанскім раёне. Фотаздымак будзе ўключаны ў кнігу пераможцаў конкурсу, а таксама прадстаўлены на выставе ў Лондане з 27 красавіка па 20 мая.

## Ну і ну!

# БЕЗБІЛЕТНІЦА НАКІНУЛАСЯ НА КАНТРАЛЁРА

**39-гадовая жыхарка вёскі Гірск Кобрынскага раёна адмовілася аплачваць праезд, чым, натуральна, выклікала абурэнне кантралёраў-рэвізораў. Выхады было два: альбо плаці штраф, альбо выходзь. Знаходлівая жанчына прыдумала трэцюю альтэрнатыву.**

Па словах прэс-сакратара УУС на транспарце Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Аляксандра Марчанкі, усе ў вагоне электрацягніка «Мінск—Баранавічы» хто не меў квіткоў, з рэвізорамі не спрачаліся. Адна толькі гэтая грамадзянка наадрэз адмаўлялася плаціць. Калі тон размовы пачаў павышацца, навакольныя зразумелі, што жартамі тут не абыдзецца. Жанчына ўстала са свайго месца, адвярнулася ад кантралёраў і, дэманстратыўна падняўшы спадніцу, прамовіла: «Вось вам мой білет!»

Маладыя супрацоўніцы зусім спужаліся, калі безбілетная грамадзянка кінулася на адну з іх, схапіла за валасы і пачала валтузіць па вагоне. Супрацоўнікі міліцыі, якіх выклікалі, калі цягнік спыніўся ў Стоўбцах, затрымалі парушальніцу. У адпаведнасці з арт. 366 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь заведзена крымінальная справа. Цяпер безбілетніцы пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да 5 гадоў. Дарэчы, квіток на гэты цягнік, калі ехаць ад пачатковага да канцавога прыпынку, каштуе каля 8 тысяч рублёў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## Усміхнемся

**Жонка прыгатавала вячэру. Самой паспытаць — страшна, ката — шкада, сядзіць, чакае мужа.**

— Дачушка, ты 5 сталовых лыжак цукру паклала, ты што, закахалася?
— Не, мама, проста я вельмі салодкі чай люблю.
— Дачка, ты іх у суп паклала...

**Чатыры дні праседзела на дыеце. Уначы захацела піць, падышла да халадзільніка, далей усё як у тумане... Ачулася, калі запівала шакаладку баршчом!**

Майстар з аўтасэрвіса тэлефануе кліенту:
— Добры дзень, ваша жонка прыехала ў наш аўтасэрвіс...
— Так-так, я ведаю, я аплачу рамонт яе аўтамабіля.
— Так, рамонт яе аўтамабіля вы аплаціце. А хто аплаціць рамонт аўтасэрвіса?

**Чэмпіянат па зімовай рыбалцы на сёмы дзень закрыла брыгада нарколагаў.**




Зяць — цешчы за абедам:
— Мама, дабаўкі не хочаце?
— Вядома, сынок!
— Гэта добра, што не хочаце.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 813. Нумар падпісаны ў 19.30 20 лютага 2012 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12